| РУ – | ремесленное училище |
| СМ – | Совет министров |
| СНК – | Совет народных комиссаров |
| СССР – | Союз Советских Социалистических Республик |
| ФЗО – | фабрично-заводское обучение |
| ЦК КП(б)Б – | Центральный Комитет Коммунистической партии большевиков Беларуси |

***Nosova A.A.*** **The organization of the repatriation and social security of orphans in BSSR**

The article « is to consider the problem of the repatriation of orphans. The author analyzes the basic normative documents, which defined and adjusted the mechanism of their transportation to BSSR and distribution on establishments of the republic. Data about their device in houses of babies, children's homes, a direction to schools of factory training are cited. Conditions of residing of orphans in children's homes of BSSR are illustrated. Questions of adoption, guardianship, patronage of the orphans are considered. Statistical data on quantity of the repatriated children and on their further distribution are resulted.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 02.12.09

УДК 930. 1 (09) (БЕИ)

*А.А. Савіч*

# НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг. У БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1920-х – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ 1950-х ГАДОЎ

У артыкуле на падставе шырокага кола гістарыяграфічных крыніц даследуецца працэс вывучэння пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у 1920-х – першай палове 1950-х гадоў. У гэты перыяд, асабліва ў 1920–1930-я гады, гістарыяграфія праблемы, акрамя навуковых задач, актыўна вырашала ідэалагічныя патрэбы бальшавіцкага кіраўніцтва, паступова падпарадкоўвалася партыйна-дзяржаўнаму апарату. Таму асвятленне пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху мела відавочна тэндэнцыйны і схематычны характар, залежала ад змен грамадска-палітычнай сітуацыі ў БССР, звязаных з асаблівасцямі развіцця нацыянальна-вызваленчага руху, адносін да заходнебеларускай праблемы з боку савецкага кіраўніцтва, палітычных рэпрэсій у БССР у дачыненні да гісторыкаў і былых удзельнікаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

**Уводзіны**

Вядома, што пасля польска-савецкай вайны Савецкая Расія вымушана была пайсці на падпісанне Рыжскага мірнага дагавора, згодна з якім заходняя частка Беларусі адышла да Польшчы. Рыжскі мір быў рэзка адмоўна ўспрыняты беларускім народам, прадстаўнікамі беларускіх палітычных партый, якія заяўлялі пра свае рашучыя намеры змагацца за яго адмену як несправядлівага, заключанага без удзелу беларусаў. Першая Усебеларуская канферэнцыя (1921 г., Прага) прыняла рэзалюцыю «Аб Рыжскім трактаце». У ёй гаварылася, што беларускі народ вёў, вядзе і будзе весці змаганне за незалежнасць і непадзельнаць Беларусі. Усе актыўныя беларускія сілы заклікаліся да рашучай рэвалюцыйнай барацьбы супраць падзелу Беларусі, ворагам беларускага народа лічыўся кожны, хто згодзіцца прызнаць Рыжскі трактат. Яго не прызнала і Другая Усебеларуская канферэнцыя, якая адбылася ў кастрычніку 1925 г. у Берліне [31, с. 144–145]. Вядома, што беларускія дзеячы, арыентаваныя на незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі, рыхтавалі і праводзілі значныя кампаніі палітычнага і нават ваеннага характару, гераічнай старонкай якіх з’яўляецца так званая заходнебеларуская партызанка.

Савецкае кіраўніцтва таксама не магло пагадзіцца з вынікамі польска-савецкай вайны і разглядала знаходжанне заходняй часткі Беларусі ў складзе Польшчы як часовае становішча. Напрыклад, кіраўнік савецкай дзяржавы У.І. Ленін яшчэ ў красавіку 1920 г. перспектывы ўз’яднання беларускага народа бачыў у развіцці рэвалюцыйнага руху ў самой Польшчы. «Вырашэнне пытання аб Беларусі, – пісаў ён, – мы прадугледжваем не сілай зброі, а выключна толькі шляхам развіцця барацьбы ўнутры Польшчы» (Ленин В.И. Речь на съезде рабочих и служащих кожевенного производства // Полн. собр. соч. – Т. 41. – С. 319). Такім чынам, вырашэнне лёсу Заходняй Беларусі звязвалася з развіццём класавай, рэвалюцыйнай нацыянальна-вызваленчай барацьбы – здзяйсненне на практыцы ідэі сусветнай рэвалюцыі.

Ідучы па шляху рэалізацыі гэтых планаў, савецкае кіраўніцтва актыўна праводзіла працу па інспірацыі і падтрымцы антыпольскіх настрояў у Заходняй Беларусі. Найбольш яркім прыкладам праяўлення такіх захадаў была арганізацыя партызанскіх груп на тэрыторыі БССР з наступнай перасылкай іх на Заходнюю

Беларусь, дзе ўзгаданыя партызанскія фарміраванні абрасталі мясцовым насельніцтвам і дастаўлялі шмат клопату польскім уладам.

**Гістарыяграфія беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы 1921–1939 гг.: станаўленне і развіццё ў 1920-х – першай палове 1950-х гадоў**

Для забеспячэння максімальнага поспеху прадпрымаемых з боку кіраўніцтва СССР і БССР захадаў па развіццю масавага антыпольскага, антыакупацыйнага руху ў Заходняй Беларусі ўзнікала неабходнасць ідэалагічнай падтрымкі ўзгаданых мерапрыемстваў. Найважнейшымі ў гэтым сэнсе былі дзеянні па выкрыванню ў перыядычным друку рознага кшталту мерапрыемстваў польскіх уладаў у Заходняй Беларусі, тым больш што палітыка Польшчы ў дачыненні да беларусаў на «крэсах» была ў канчатковым выніку скіравана на іх паланізацыю.

Таму ўжо ў пачатку 1920-х гадоў у перыядычным друку БССР з’явіліся артыкулы, прысвечаныя заходнебеларускай праблематыцы [5]. Аўтары ўзгаданых прац у сваіх публікацыях уздымалі пытанні знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы, давалі ацэнку эканамічнаму і палітычнаму становішчу, якое складвалася ў той час на «крэсах», разглядалі актуальныя пытанні рэвалюцыйнай барацьбы, задачы, тактыку і лозунгі кампартыі. Акрамя таго, што ўзгаданыя публікацыі разам з рэзалюцыямі партыйных з’ездаў, канферэнцый і пленумаў ЦК Кампартыі Польшчы (КПП) і Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) з’яўляліся кіраўніцтвам да дзеяння камуністаў, першым марксісцкім асвятленнем тагачаснай гісторыі Польшчы і Заходняй Беларусі, яны вырашалі і чыста ідэалагічныя задачы. Сутнасць гэтых задач была ў тым, каб давесці да ведама шырокай грамадскасці інфармацыю пра тэрор і гвалт польскіх уладаў у дачыненні да мясцовага беларускага жыхарства, а зыходзячы з гэтага, даказаць справядлівасць і неабходнасць разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне і ўз’яднанне з БССР. Такім чынам, публікацыі ў перыядычным друку павінны былі садзейнічаць уздыму рэвалюцыйнага руху ў краі, аказаць маральна-палітычную падтрымку яго ўдзельнікам у змаганні з польскім рэжымам.

Але пасля таго, як партызанскі рух у Заходняй Беларусі паступова пайшоў на спад і да канца 1925 года быў згорнуты, спадзяванні на вырашэнне заходнебеларускай праблемы з дапамогай збройнай сілы не апраўдалі сябе. У гэтых умовах узгаданая вышэй публіцыстычная праца не магла задаволіць савецкае кіраўніцтва, якое вельмі ўважліва сачыла за становішчам у Заходняй Беларусі. Выразна выявілася неабходнасць стварэння ўстаноў, якія б на навуковым узроўні вывучалі і аналізавалі сітуацыю ў Заходняй Беларусі, выказваючы свае навукова абгрунтаваныя думкі. Такімі навуковымі і выдавецкімі цэнтрамі ў 20-30-я гады XX стагоддзя былі Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі, заходні сектар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б, Інстытут польскай пралетарскай культуры [1; 2; 8]. Гэтыя ўстановы праводзілі значную працу па вывучэнню і асвятленню ў друку пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі. Аднак іх дзейнасць была таксама карысна ДПУ-НКУС і яе рэзідэнцыям, што дзейнічалі ў Заходняй Беларусі, аб чым справядліва сказаў В. Астрога. «Патрэбная інфармацыя, якая паступала ў аддзел вайсковай выведкі Дзяржпалітупраўленьня, павінна была дапамагчы зарыентавацца ў грамадзкім ды палітычным жыцьці суседняе краіны, дасканала ведаць заходнебеларускую спэцыфіку. Бо тое, пра што хлусілі маскоўскія ды менскія газэты пра быццам бы надыходзячую ў Польшчы пралетарскую рэвалюцыю, зусім не адпавядала рэчаіснасьці. Каб весьці эфэктыўную шпіёнскую ды падрыўную дзейнасьць на «крэсах», неабходна была дакладная аналітычная інфармацыя» [2, с. 164]. Пра палітычную абумоўленасць дзейнасці КЗБ гаворыць і І.І. Шаўчук, які наступным чынам вызначыў яе задачы: «Даследаваць эканамічную і сацыяльную

структуру Заходняй Беларусі, палітычнае жыццё, гэта значыць праграмы, тактыкі, уплывы, структуры варожых партый, дзейнасць рэвалюцыйных арганізацый і ў першую чаргу КПП і КПЗБ; вывучаць Заходнюю Беларусь як плацдарм вайны, якая рыхтуецца польскім імперыялізмам і беларускім нацыянал-фашызмам супраць СССР; весці масавую прапагандысцкую працу. Асаблівае месца займала сувязь камісіі з цэнтрамі беларускай рабочай эміграцыі ў Еўропе і Амерыцы» [45, с. 46–47].

Падзеі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі атрымалі ў 1920–1930-я гады адлюстраванне ў шматлікіх перыядычных выданнях КПП, КПЗБ, Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), арганізацыі «Змаганне» і Таварыства беларускай школы (ТБШ), а таксама Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам (МОПР) Заходняй Беларусі [15; 23]. Значную працу па асвятленню ў прапагандысцка-агітацыйным рэчышчы пытанняў названай праблемы праводзіў часопіс «Бальшавік Беларусі». На яго старонках у 1920–1930-я гады была надрукавана вялікая колькасць артыкулаў, дакументальнах матэрыялаў, прысвечаных пытанням эканамічнага і палітычнага становішча ў Заходняй Беларусі, унутрыпартыйнага жыцця КПЗБ, яе ўдзелу і ролі ў рэвалюцыйным руху [29; 40].

Аднак неабходна адзначыць, што названыя вышэй публікацыі ў перыядычным друку не мелі навуковага характару. Яны, з’яўляючыся правадніком афіцыйных поглядаў адпаведных партыйных і грамадскіх арганізацый на падзеі жыцця ў Заходняй Беларусі, утрымлівалі шматлікія суб’ектыўныя ацэнкі і сёння ўяўляюць цікавасць як крыніцы.

Што тычыцца непасрэдна вывучэння пытанняў гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, то ў 1920–1930-я гады былі сфармуляваны асноўныя накірункі даследавання названых праблем. Да найбольш распаўсюджаных тэм у гістарычнай літаратуры, прысвечаных заходнебеларускай тэматыцы, адносіліся пытанні палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча беларускага народа ў Заходняй Беларусі. Пры іх разглядзе назіралася, што зразумела, адзінадушша аўтараў у адносінах да ацэнкі тых ці іншых пытанняў узгаданых праблем. Увага акцэнтавалася на сацыяльным, эканамічным прыгнёце з боку польскіх уладаў, палітычным бяспраўі беларускага народа ў Заходняй Беларусі. Аўтары падкрэслівалі, што эканоміка ў Заходняй Беларусі мела характар каланіяльны, аграрна-сыравінны, які дапаўняўся малазямеллем сялян, насаджэннем асадніцтва, камасацыі, закрыццём беларускіх школ, праваслаўных цэркваў і іншым [6; 9; 24; 27, 28; 35; 44; 46; 47].

Гэткім чынам павінна была вырашацца ідэалагічная задача – давесці да насельніцтва думку пра тое, што жыхары Заходняй Беларусі пакутуюць пад «ярмом» польскіх паноў, у той час як людзі ў БССР жывуць намнога лепш, чым іх адзінакроўныя браты ў Заходняй Беларусі. Такія высновы павінны былі прывесці да думак аб неабходнасці разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы супраць польскіх улад, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа. Пры гэтым ад імя заходнебеларускага насельніцтва выказвалася надзея на дапамогу ў вызваленні з боку Савецкага Саюза.

Неабходна адзначыць, што аўтары, якія закраналі пытанні рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, ацэньвалі развіццё рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі як працэс узрастаючы, даводзілі, што рух за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне мацнеў і ахопліваў усё больш шырокія колы насельніцтва Заходняй Беларусі, прычым Кампартыі Заходняй Беларусі бясспрэчна адводзілася авангардная роля ў гэтай барацьбе. «У Заходняй Беларусі элементы грамадзянскай вайны, нарастаючы з кожным днём, могуць хутка перарасці ў адкрыты бой з фашызмам і кіраўніцтва гэтым боем належыць КПЗБ», – пісаў Л. Якаўлеў у 1931 г. [48, с. 86].

Зыходзячы з вышэйадзначанага палажэння ў гістарычнай літаратуры, аўтары значную ўвагу надавалі асвятленню розных бакоў дзейнасці КПЗБ як галоўнай, авангарднай сілы, якая ўзначальвала рэвалюцыйную барацьбу насельніцтва Заходняй Беларусі. Напрыклад, аўтары брашуры «Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады» (Мінск,1932) далі наступны пералік спраў КПЗБ: наладжванне дэманстрацый салідарнасці прамысловага пралетарыяту з супрацьпадаткавым змаганнем сялян, змаганне за права нацый на самавызначэнне, аж да аддзялення, арганізацыя змагання з камасацыяй, дэмаскаванне польскага імперыялізму ў падрыхтоўцы вайны з СССР, вядзенне барацьбы супраць праследавання беларускіх школ, беларускага настаўніцтва, беларускіх служачых, няўхільнае тлумачэнне масам здрадніцкай контррэвалюцыйнай ролі правадыроў згодніцкіх арганізацый у Заходняй Беларусі і іншае.

Гістарыяграфічная сітуацыя ў БССР рэзка змянілася ў пачатку 1930-х гадоў пасля гучных палітычных спраў «Саюза вызвалення Беларусі» (1930 г.) і «Беларускага нацыянальнага цэнтра» (1933 г.). Ахвярамі палітычных рэпрэсій сталі не толькі дзеячы беларускага нацыянальнага руху, у тым ліку ў Заходняй Беларусі (кіраўніцтва БРА, БСРГ, ТБШ), але і вучоныя, якія займаліся распрацоўкай заходнебеларускай гісторыі [1; 2, с. 257; 45, с. 47]. Таму не дзіўна, што з гэтага часу пачынаюць рэзка мяняцца фармулёўкі. Напрыклад, у гістарычнай літаратуры ў пачатку 1930-х гадоў у адносінах да стварэння КПЗБ з'явіўся тэзіс аб тым, што КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, якія праводзілі сваю працу ў буйных гарадах Заходняй Беларусі яшчэ да стварэння КПЗБ. Такім чынам, гэтак званая тэорыя «двухкарэннасці» КПЗБ, згодна з якой КПЗБ утварылася з арганізацый КПРП, Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА) і некаторых дробнабуржуазных нацыяналістычных арганізацый, абвяргалася [7, с. 3–4].

Заўважым, што гэтая выснова была зроблена пасля рэпрэсій з боку савецкіх уладаў у адносінах да былых кіраўнікоў БРА, якія разам з іншымі актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі выехалі ў БССР у выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай. Да гэтага часу дзейнасць БРА не падвяргалася крытыцы. Пасля вышэйузгаданых рэпрэсій у беларускай гістарычнай літаратуры былі зроблены высновы пра тое, што КПЗБ, прымаючы ў свае шэрагі БРА цэлай арганізацыяй, зрабіла вялікую палітычную памылку, таму што разам з часткай сапраўдна па-камуністычнаму настроеных элементаў такім шляхам пралезла ў КПЗБ група буржуазных нацыяналістаў, якія ўступілі ў кампартыю з мэтай узначалення рэвалюцыйнага руху і разгрому яго знутры [38, с. 265–266]. У гэтых меркаваннях лёгка заўважыць спробу апраўдання рэпрэсій у адносінах да былых ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, што зрабіць трэба было зноў жа па ідэалагічных прычынах. Трэба было растлумачыць грамадскасці тэрор і гвалт над яе прадстаўнікамі.

Не маглі даследчыкі пакінуць убаку пытанне аб нацыянальнай фракцыі ў КПЗБ, гэтак званай «сэцэсіі». Не ўдаваючыся ў падрабязнасці справы, аўтары публікацый спяшаліся без прывядзення сур'ёзных аргументаў абвінаваціць «сэцэсію» і яе ўдзельнікаў у правядзенні антыпартыйнай, падрыўной працы, якая заключалася ў патрабаванні стварэння самастойнай, незалежнай ад Кампартыі Польшчы, Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі з большым ухілам у бок нацыянальна-вызваленчых, а не леварадыкальных, пралетарскіх мэтаў.

Яшчэ больш жорсткім характарыстыкам у БССР і падпольным камуністычным друку пачала падвяргацца «сэцэсія» пасля рэпрэсіяў у БССР у адносінах да былых членаў БРА. Адзначалася, што “пралезшыя ў КПЗБ буржуазныя нацыяналісты з БРА хутка паспрабавалі правесці раскол у партыі і захоп кіраўніцтва пад выглядам г. зв. «сэцэсіі». «Сэцэсія была контррэвалюцыйнай групай, арганізаванай правакатарскімі

элементамі, якія пралезлі ў партыю і працавалі пад кіраўніцтвам польскай дэфензівы (ахранкі) і буржуазных нацыяналістаў па абодва бакі мяжы (Ігнатоўскі, Гурын-Маразоўскі). Асноўны касцяк «Сэцэсіі» складалі выхадцы з БРА (Сталевіч, Радзевіч, Капуцкі, Гарбацэвіч і інш.). Ідэалогія «Сэцэсіі» поўнасцю вырастала з ідэалогіі БРА [38, с. 266]. Прыблізна такога кшталту высноў вымушаны быў прытрымлівацца і былы лідэр БРА І.К. Лагіновіч (П. Корчык) у сваім артыкуле, прысвечаным пытанням БРА і «Сэцэсіі» [26] і іншыя [33; 40].

Значную ўвагу даследчыкаў у другой палове 1920-х – 1930-я гады прыцягнула гісторыя ўзнікнення Беларускай сялянска-работніцкай грамады, пераўтварэнне яе ў масавую рэвалюцыйную арганізацыю, сацыяльна-палітычны характар БСРГ, яе роля і значэнне ў развіцці рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі [3; 5; 20]. У працах, прысвечаных Грамадзе, гэтая арганізацыя характарызуецца як самая ўплывовая ў Заходняй Беларусі. Аўтары, знаёмячы з асноўнымі пунктамі праграмы Грамады, даводзілі, што ў ёй і дзеяннях арганізацыі пераважала не рабочая, а сялянская ідэалогія, адзначалі дробнабуржуазны, некамуністычны характар БСРГ, але пры гэтым падкрэслівалі, што Грамада бліжэй за іншыя палітычныя арганізацыі стаіць да партыі пралетарыяту.

Абавязковай бадай што для ўсіх прац была прысутнасць выкрывання «правакацыйных» заяў польскага буржуазнага друку і прадстаўнікоў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый аб «як быццам бы існуючай сувязі Грамады з камуністычным рухам, удзельнікі якога атрымалі магчымасць легальнай працы». «Дзейнасць і хуткі рост уплыву Грамады ўстрывожыў польскі буржуазны ўрад і грамадскую думку. Увесь польскі буржуазны друк, не выключаючы і левай часткі, адкрыў жорсткую кампанію супраць Грамады, усяляк даказваючы, што гэта партыя з'яўляецца камуністычнай арганізацыяй, і калі прыняла іншую назву, то толькі для таго, каб атрымаць магчымасць легальнай працы.» Аўтары папракалі, напрыклад, БХД, якая «сама нямала садзейнічала распаўсюджанню ілжывых чутак аб апошняй (аб Грамадзе) і ўсяляк даказвала дачыненне Грамады да камуністычнага руху і яе антыдзяржаўнай дзейнасці» [21, с. 206, 211]. Публікацыі павінны былі маскіраваць відавочную ўжо на той час сувязь БСРГ з КПЗБ.

Паступова, па меры аддалення ад часу, калі існавала БСРГ, фармулёўкі пачалі крыху мяняцца. «БС-РГ, не зьяўляючыся камуністычнай арганізацыяй, як гэта ёй прыпісвала дэфензіўная ўлада і беларускія нацыянал-фашысты, але, аднак, яна была выяўнікам інтарэсаў шырокіх працоўных сялянскіх колаў Заходняе Беларусі», – адзначылі Я. Багданскі і Л. Баброўіч у сваёй працы [3, с. 23]. А ўжо ў кнізе «Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине» прама гаварылася: «Пад кіраўніцтвам КПЗБ … вырастае стотысячная баявая нацыянальна-вызваленчая арганізацыя – Грамада» [38, с. 25]. Спрошчана і палітызавана падавалася дзейнасць Таварыства беларускай школы [32].

Значнае месца ў апісанні палітычнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі адводзілася паказу дзейнасці беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый. Гэты працэс хутчэй за ўсё можна назваць шальмаваннем, бо дзейнасць гэтых арганізацый і яе членаў увесь час паказвалася рознымі сродкамі як варожая беларускаму народу, згодніцкая ў адносінах да польскіх уладаў [3; 7; 21; 33; 34; 38; 48]. Але неабходна адзначыць, што гэткім чынам шмат было зроблена і на карысць гістарычнай навукі. Азнаёміўшыся і прааналізаваўшы працы, у якіх асвятляліся розныя бакі дзейнасці такіх арганізацый, як Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларускі сялянскі саюз, Беларуская санацыя і іншых, трэба адзначыць, што разам са шматлікімі ідэалагічнымі штампамі, накшталт «непрымірымыя ворагі рэвалюцыйнай барацьбы», «платныя арганізацыі», «палітычныя адбросы», «беларускія нацыянал-фашысты», «агенты

дэфензівы» і інш., у гэтых працах змешчана шмат карыснай для даследчыкаў інфармацыі, якая дае магчымасць азнаёміцца з асноўнымі праграмнымі ўстаноўкамі і палітычнай практыкай гэтых арганізацый. Галоўная ж думка такіх прац заключалася ў тым, што беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі і арганізацыі з'яўляюцца злейшымі ворагамі КПЗБ, БСРГ, БССР і не маюць ўплыву сярод шырокіх пралетарскіх і сялянскіх мас.

З цягам часу надзеі савецкага кіраўніцтва на перамогу пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы пачалі згасаць, бо ў грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне ў цэлым і ў Заходняй Беларусі ў прыватнасці не было аб'ектыўных перадумоў для перарастання хваляў рэвалюцыйных выступленняў ва ўзброенае паўстанне, якое б вырашыла праблему Заходняй Беларусі. У такой сітуацыі заходнебеларускае пытанне магло быць вырашана іншымі спосабамі.

Больш за тое, у сярэдзіне 1930-х гадоў магутная хваля палітычных рэпрэсій у БССР захапіла сваім крылом і дзеячаў рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Не пазбеглі такога лёсу і кіраўнікі КПП і КПЗБ. Паступова ўвесь камуністычны рух у Польшчы быў скампраметаваны, што не магло не адбіцца на асвятленні ў друку пытанняў яе рэвалюцыйнага руху. Колькасць публікацый змяняецца ў бок памяншэння, у іх пакрыху пачынаюць знікаць назвы кампартый Польшчы і Заходняй Беларусі.

Выканкам Камінтэрна, які ў 1938 г. прыняў рашэнне аб роспуску КПП, знаходзіўся пад уплывам кіраўніцтва СССР. І. Сталін добра разумеў, што польскае, у тым ліку і заходнебеларускае, пытанне вырашыцца хутчэй за ўсё ў выніку рэалізацыі намераў Гітлера пашырыць жыццёвую прастору для «арыйскай» нацыі за кошт Польшчы. Як вядома, так яно і адбылося, прычым Савецкі Саюз прыняў самы актыўны ўдзел у ліквідацыі польскай дзяржавы, вярнуўшы Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. У гэтай сітуацыі мерапрыемствы па інспірацыі і падтрымцы рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, а таксама ідэалагічнае абгрунтаванне неабходнасці развіцця гэтай барацьбы адыходзілі на задні план.

Адзначым, што дзейнасць Інстытута польскай пралетарскай культуры, Камісіі па вывучэнню Заходняй Беларусі, а таксама Інстытута гісторыі партыі з заходнім сектарам была спынена менавіта ў другой палове 30-х гадоў. У 1936 г. замежная мінская частка цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ поўнасцю згарнула сваю дзейнасць. Спынілася выданне тэарэтычнага часопіса ЦК КПЗБ «Бальшавік» [34, с. 209]. Гэтаксама неактуальнай і непатрэбнай станавілася вывучэнне дзейнасці КПП і КПЗБ.

Вынікам рашэння аб роспуску ў 1938 г. КПЗБ як складовай часткі КПП стала змяненне акцэнтаў і фармулёвак у беларускай гістарыяграфіі ў асвятленні пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху. Гэтаму спрыяла ўз'яднанне восенню 1939 г. Заходняй Беларусі з БССР у выніку паходу Чырвонай Арміі. Пасля згаданых падзей гісторыя КПЗБ амаль не вывучалася, палітычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва рэвалюцыйнай барацьбой з боку кампартыі ігнаравалася ў большасці публікацый [10; 19; 37].

Выключэннем з гэтага шэрагу з'яўляюцца кніга І.Ф. Лочмеля «Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов» (Мн., 1940) і калектыўная праца «Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне» (Мн., 1940). У апошняй, напрыклад, гаварылася: «У авангардзе рэвалюцыйных баёў ішоў нешматлікі рабочы клас Заходняй Беларусі. Рэвалюцыйнай барацьбой кіравала Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, якая працавала ў надзвычай цяжкіх умовах падполля, была акружана шпіёнамі і правакатарамі і падвяргалася жорсткім рэпрэсіям» [22, с. 58].

Змяніліся погляды і на гісторыю БСРГ. Ва ўжо згаданай вышэй працы па пытанню стварэння Грамады сцвярджалася, што арганізацыя была створана з дазволу «ўрада акупантаў», які, садзейнічаючы гэтаму, «разлічваў узяць яе пад свой нагляд і

кіраўніцтва, абясшкодзіць масавы рух, разлажыць яго знутры і, нарэшце, разграміць, … паставіў на чале Грамады сваіх агентаў-правакатараў з лагера сваіх прыслужнікаў – беларускіх нацыяналістаў» [22, с. 56]. Што да пытання рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху, то яго развіццё пасля роспуску КПЗБ у гістарычнай літаратуры паказвалася як стыхійны працэс, выкладалася павярхоўна, схематычна, напрыклад: «Працоўныя Заходняй Беларусі неаднаразова паўставалі супраць сваіх прыгнятальнікаў. … На чале гэтай барацьбы знаходзіўся беларускі пралетарыят. … Сяляне неаднаразова рознымі сродкамі вялі барацьбу супраць памешчыкаў і польскіх акупантаў» [19, с. 32, 34].

Такім чынам, нягледзячы на недахоп кваліфікаваных кадраў і маладаступнасць рэпрэзентатыўных крыніц, на значны, часцей за ўсё адмоўны, уплыў партыйна-дзяржаўнай ідэалогіі, супрацоўнікі навукова-выдавецкіх цэнтраў, партыйныя работнікі, удзельнікі нацыянальна-вызваленчага руху падрыхтавалі значную колькасць публікацый. Гэта патрабуе крытычных адносін да разгледжанай літаратуры. Яны напісаны галоўным чынам на фактах, якія давала само жыццё і якія былі зафіксаваны перыядычным друкам. І таму асвятленне гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў значнай ступені было фрагментарным. Для работ 1920–1930-х гадоў характэрна больш эмпірычнае апісанне падзей, чым іх глыбокі навуковы аналіз на аснове шырокага кола дакументальных крыніц. Гэтыя артыкулы, брашуры, манаграфіі, падрыхтаваныя на небагатай крыніцазнаўчай базе, пазначылі галоўныя напрамкі даследавання праблем і раставілі навуковыя і палітычныя акцэнты згодна марксісцка-ленінскіх падыходаў пры асвятленні гістарычных з’яў. У работах, напісаных па гарачых слядах, пад дыктоўку тагачасных ідэалагічных і палітычных задач, падзеі нацыянальна-вызваленчага руху ацэньваліся тэндэнцыйна, з улікам іх карысці камуністычнаму руху, а фактычна бальшавіцкаму кіраўніцтву. У іх знайшлі адлюстраванне асобныя памылковыя погляды і вывады, якія былі тады ў КПЗБ, КПП і Камінтэрне, перабольшвалася правая небяспека ў кампартыі, сцвярджалася, што гэтак званыя беларускія буржуазныя нацыяналісты – галоўныя ворагі працоўных у іх барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, пераацэньвалася рэвалюцыйнасць мас на пэўных этапах класавай барацьбы.

Вялікая Айчынная вайна перарвала развіццё гістарычнай навукі БССР, у тым ліку і навуковую распрацоўку розных аспектаў гісторыі Заходняй Беларусі. З сярэдзіны 1940-х гадоў у перыядычным друку пачалі з’яўляцца артыкулы пераважна агітацыйна-прапагандысцкага характару [17; 25; 36]. Галоўнай іх мэтай было відавочнае імкненне падкрэсліць гаротнае жыццё беларускага народа ў складзе Польшчы, ухваліць паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, а таксама поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ва ўз’яднанай Беларусі.

Надзвычай актыўную працу па асвятленню пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. правёў у 40-я гады Ц.С. Гарбуноў, які надрукаваў шэраг сваіх даследаванняў [11; 12; 13; 14; 16]. У іх аўтар рабіў акцэнт на разглядзе і канстатацыі цяжкага становішча працоўных Заходняй Беларусі, асвяціў вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў верасні 1939 г., працу Народнага сходу Заходняй Беларусі. Аднак працы Ц.С. Гарбунова ўтрымлівалі цэлы шэраг вульгарызаваных ацэнак і высноў. Так, беларускі рэвалюцыйна-дэмакратычны накірунак вызваленчай барацьбы і яго кіраўнікі ацэньваліся як нацыяналістычныя, БСРГ, а значыць і яе лідэры, характарызаваліся як дробнабуржуазныя. У адной з сваіх прац Ц. Гарбуноў асобны параграф прысвяціў адлюстраванню дзейнасці беларускіх нацыянальных дзеячаў, назваў яго красамоўна «Здрадніцкая роля беларускіх нацыяналістаў». Прадстаўнікі беларускага руху агулам, без уліку партыйнай прыналежнасці, аб’яўляліся агентамі польскіх акупантаў. «Разграміўшы Беларуска-Сялянска-Работніцкую Грамаду і Таварыства беларускай

школы, пілсудчыкі наладзілі суд над усімі актыўнымі кіраўнікамі гэтых арганізацый, не выключаючы сваіх агентаў. Праўда, А. Луцкевіч, Р. Астроўскі былі ў хуткім часе вызвалены, але Рак-Міхайлоўскі, Б. Тарашкевіч, Мятла і іншыя былі прыгавораны да турэмнага зняволення разам з грамадоўцамі. Пілсудчыкі стваралі сваім агентам папулярнасць у массах, каб зноў выкарыстоўваць іх для гнуснай здрадніцкай працы» [16, с. 137].

Палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і нацыянальнае жыццё жыхароў Заходняй Беларусі, развіццё рэвалюцыйнага руху, сацыялістычныя пераўтварэнні пасля верасня 1939 г. коратка асветлены ў брашурах Н.В. Каменскай «Уз'яднанне беларускага народа ў адзінай Беларускай Савецкай сацыялістычнай дзяржаве» (Мінск, 1948) і «10 год сацыялістычнага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР» (Мінск, 1949). Яны насілі прапагандысцкі характар і выйшлі ў друку да дзесятай гадавіны ўз'яднання беларускага народа.

Неабходна сказаць, што ў першай палове 1950-х гадоў паступова складваліся ідэйна-палітычныя і навукова-тэарэтычныя перадумовы паглыбленага вывучэння гэтых праблем. Яны былі звязаны з тым, што ў той час група маладых гісторыкаў звярнулася да навуковага аналізу вопыту сацыялістычных пераўтварэнняў у заходніх абласцях БССР у верасні 1939 – пачатку 1950-х гадоў і падрыхтавала шэраг кандыдацкіх дысертацый. Першай такой працай была кандыдацкая дысертацыя аб рэвалюцыйна-вызваленчым руху ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. А.У. Царука, падрыхтаваная і абароненая ім у БДУ ў 1955 г. [43]. У іншых працах разглядаліся асобныя аспекты гісторыі рэвалюцыйнай вызваленчай барацьбы ў Заходняй Беларусі. Так, у дысертацыі К.І. Дамарада аналізаваліся сацыяльна-эканамічныя адносіны, стан сельскай гаспадаркі, становішча сялянства і абвастрэнне класавых супярэчнасцяў у заходнебеларускай вёсцы ў 1919–1939 гг.

Для далейшага даследавання праблем гісторыі рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі прынцыповае значэнне мела заява прадстаўнікоў ЦК камуністычных партый Савецкага Саюза, Балгарыі, Фінляндыі, Італіі і Польскай аб'яднанай рабочай партыі, якую яны зрабілі ў 1956 г. падчас працы ХХ з'езда КПСС. У заяве гаварылася, што абвінавачванне было лжывым, а роспуск партыі неабгрунтаваным. Давалася высокая ацэнка рэвалюцыйнай дзейнасці КПП, у тым ліку і КПЗБ. Аднаўленне гістарычнай справядлівасці ў адносінах да КПП і КПЗБ стварыла спрыяльныя ўмовы для навуковага асвятлення іх гісторыі, а таксама пытанняў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Гэтыя падзеі адкрывалі ў даследаванні праблем гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. новы перыяд.

**Заключэнне**

Такім чынам, пачатак навуковага асвятлення праблем гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі быў закладзены ў 1920–1930-я гады, калі дзейнічалі навуковыя ўстановы, якія займаліся распрацоўкай пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі. Такімі ў той час з'яўляліся Камісія па вывучэнню Заходняй Беларусі пры Інбелкульце, а затым пры Беларускай Акадэміі навук, заходні сектар пры Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КП(б). Навуковая праца па згаданай праблематыцы праводзілася таксама і ў Інстытуце польскай пралетарскай культуры пры БАН.

Неабходна адзначыць, што на актыўнасць працы навуковых устаноў вялікі уплыў аказвала грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне і цікавасць да становішча ў Польшчы з боку савецкага кіраўніцтва, якое лічыла знаходжанне Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы часовым. Вывучэнне і асвятленне ў друку пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі выконвала ў першую чаргу ідэалагічную задачу, якая заключалася ў тым, каб давесці да шырокіх пластоў насельніцтва інфармацыю пра гаротнае жыццё

народа ў Заходняй Беларусі і абгрунтаваць неабходнасць рэвалюцыйнай барацьбы супраць польскай улады.

Перыяд вывучэння акрэсленых праблем у 1921 – першай палове 1950-х гадоў можна назваць часам станаўлення, яго неабходна падзяліць на два этапы. Першы – ад 1921 года да пачатку 1930–х гадоў, другі этап – 1930-я – першая палова 1950-х гадоў. Гэтыя этапы адрозніваюцца, перш за ўсё, грамадска-палітычнымі ўмовамі правядзення навукова-даследчыцкай і выдавецкай працы. У пачатку 1930-х гадоў беларуская гістарычная навука была падвергнута жорсткім рэпрэсіям, што не магло не аказаць адмоўнага ўплыву на яе развіццё. У той час падвяргаліся рэпрэсіям былыя кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, якіх залічылі да «ворагаў народа», была распушчана як складовая частка КПП Кампартыя Заходняй Беларусі, а большасць яе членаў таксама падвергнуты праследам. Гэтыя акалічнасці аказалі вырашальны ўплыў на вывучэнне гісторыі Заходняй Беларусі і расстаноўку палітычных акцэнтаў. У сувязі з гэтым доўгі час азначаныя пытанні не падвяргаліся дастаткова грунтоўнаму навуковаму даследаванню.

Навуковую значнасць і важнасць публікацый зніжала адсутнасць у даследчыкаў магчымасці працаваць з дакументальнымі матэрыяламі. Архівы па гэтых праблемах не былі даступныя для гісторыкаў. Падобная тэматыка не ўключалася ў планы навукова-даследчыцкіх устаноў. Перыядычны друк асвятляў гэтыя сюжэты толькі ў агітацыйна-прапагандысцкім рэчышчы, павярхоўна, у схематычнай форме. Якасны зрух у вывучэнні гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі пачаўся з радыкальным змяненнем палітычнай сітуацыі ў СССР у сярэдзіне 1950-х гадоў.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Астрога, В. Вывучэнне польскай гісторыі на Беларусі (1921–1941 гг.) / В. Астрога // Берасцейскі храногРаф : зб. навук. прац. – Брэст : Выд. С. Лаўрова, 1999 : Вып. 2.– С. 254–255.

2. Астрога, В.А. «Шпіёнскае гняздо»: стварэньне і дзейнасьць Камісіі па вывучэньні Заходняе Беларусі / В.А. Астрога // Спадчына. – 1996. – № 6. – С. 156–167.

3. Багданскі, Я. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады / Я. Багданскі, Л. Бабровіч. – Менск : Беларус. Акад. навук, Каміс. Заход. Беларусі, 1932. – 67 с.

4. Баравы, М. Жыцьцё вясковай моладзі ў Заходняй Беларусі / М. Баравы // Маладняк. – 1923. – № 1. – С. 60–63; Жылуновіч, З. Нельга маўчаць! / З. Жылуновіч // Сав. Беларусь. – 1923. – № 91; Жылуновіч, З. Панскае засяленне Заходняй Беларусі / З. Жылуновіч, // Сав. Беларусь. – 1921. – № 59 ; Жылуновіч, З. Як паны робяць з Беларусі Польшчу / З. Жылуновіч // Сав. Беларусь. – 1921. – № 88 ; Жыцень, Л. Водгулее з Заходняй Беларусі / Л. Жыцень // Сав. Беларусь. – 1923. – № 19 ; Зямельная справа ў Заходняй Беларусі // Сав. Беларусь. – 1923. – №34 ; Каты, каты! // Сав. Беларусь. – 1921. № 129 ; М.с. Будучыя соймавыя выбары і Заходняя Беларусь // Сав. Беларусь. – 1924. – № 37 ; У Заходняй Беларусі // Сав Беларусь. – 1923. – № 133, 141, 142, 148, 149, 150, 161, 168, 171, 180, 184, 186, 188, 196, 219, 237, 239; Югасюк. Заходняя Беларусь пад панскай Польшай (ад нашага варшаўскага карэспандэнта) / Югасюк // Сав. Беларусь. – 1923. – № 153.

5. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. – Менск : Дзяржвыд., 1928. – 54 с.

6. Боген, Д. Преследование меньшинства в Польше / Д. Боген. – М., 1927.

7. Валевіч, І.Р. Першыя гады Кампартыі Заходняй Беларусі. Успаміны падпольшчыка. 1921–1925 гг. / І.Р. Валевіч. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1935. – 48 с.

8. Вахтомаў, Г.В. Станаўленне гістарыяграфіі рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі / Г.В. Вахтомаў, У.М. Міхнюк // Весці АН БССР. Сер. грамадскіх навук. – 1988. – № 5. – С. 118–125.

9. Гарбацэвіч, П. Палёнізацыя Заходняй Беларусі / П. Гарбацэвіч. – Менск : Беларус. Акад. навук, камісія Заход. Беларусі, 1932. – 34 с.

10. Гарбуноў, Ц. Год пад сцягам саветаў / Ц. Гарбуноў. – Мінск : Дзярж. выд-ва пры СНК, Рэд. паліт. літ-ры, 1940. – 56 с.

11. Гарбуноў, Ц. Уз’еднаная Совецкая Беларусь / Ц. Гарбуноў. – Мінск : Дзяржвыдва БССР, 1945. – 40 с.

12. Гарбуноў, Ц. Уз’еднанне беларускага народа ў адзінай совецкай соцыялістычнай дзяржаве / Ц. Гарбуноў. – Мінск : Дзяржвыдва БССР, 1949. – 188 с.

13. Гарбуноў, Ц. Уз’еднанне беларускага народа ў адзінай совецкай соцыялістычнай дзяржаве / Ц. Гарбуноў. 2-е выд. – Мінск : Дзяржвыдва БССР, 1952. – 220 с.

14. Гарбуноў, Ц. Уз’яднанне беларускага народа ў адзінай Беларускай совецкай соцыялістычнай дзяржаве / Ц. Гарбуноў // Полымя. – 1948. – № 2. – С. 89–107; № 3. – С. 64–89.

15. Говін, С.В. Друк Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / С.В. Говін. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1974. – 95 с.

16. Горбунов, Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М : Гос. изд-во полит. лит-ры, 1948. – 232 с.

17. Граков, Н. Как жили трудящиеся Западной Белоруссии в панской Польше / Н. Граков // Сов. Белоруссия. – 1947. – 14 сент.

18. Доморад, К.И. Борьба Коммунистической партии за коллективизацию сельского хозяйства западных областей Белоруссии накануне Великой Отечественной войны (сентябрь 1939 – июнь 1941 гг.) : атореф. дис. ... канд. ист. наук / К.И. Доморад. Бел. гос. ун-т. – Минск, 1955. – 15 с.

19. Егоров, Г. Западная Белоруссия / Г. Егоров. – М.: Гос. изд-во полит. лит-ры, 1939. – 40 с.

20. Западная Белоруссия на скамье подсудимых. Процесс Белорусской Крестьянско-Рабочей Громады. – Минск : Бел. гос. изд-во, 1929. – 263 с.

21. Западная Белоруссия : сб. ст. Кн. 1. – Менск : Бел. гос. изд-во, 1927. – 211 с.

22. Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне / пад рэд. Н.М. Нікольскага і І.Ф. Лочмеля. – Мінск : Выд. АН БССР, 1940. – 96 с.

23. Зелинский, П.И. Печать КПЗБ в борьбе за свободу / П.И. Зелинский, Н.А. Ракевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1977. – 144 с.

24. Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сейм. 1922-1926 гг. – Менск: Бел. дзярж. выд., 1927. – 496 с.

25. Каменская, Н. Воссоединение белорусского народа в едином Белорусском Советском государстве / Н. Каменская // Сов. Белоруссия. – 1947. – 17 сент.

26. Корчык, П. Нацыянал-апартунізм у КПЗБ і ідэалагічная спадчына «Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі» / П. Корчык // Бальшавік Беларусі. – 1934. – № 7. – С. 35–43.

27. Краіна шыбеніц і карных экспедыцый : зб. фактаў і лічбаў. – Менск : Беларус. Акад. навук, Каміс. па вывучэньні Заходняе Беларусі, 1932. – 74 с.

28. Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Менск : Бел. дзярж. выд-ва, 1926. – 56 с.

29. Матэлевіч, М. Другі пленум ЦК КПЗБ / М. Матэлевіч // Бальшавік Беларусі. – 1929. – № 4. – С. 20–27; Аб кіраўніцтве эканамічнымі баямі і задачы партыі ў прафруху : Рэзалюцыя V пленума ЦК КПЗБ // Бальшавік Беларусі. – 1931. – № 8/9. – С. 74–78; Задачы партыі ў галіне вызваленчай барацьбы прыгнечаных народаў:

(Рэзалюцыя V пленума ЦК КПЗБ) // Бальшавік Беларусі. – 1931. – № 8/9. – С. 64–73; Сталевіч А. Заявы III пленума ЦК КПЗБ // Бальшавік Беларусі. – 1929. – № 10–12. – С. 104; ён жа. Напярэдадні баёў за ўладу // Бальшавік Беларусі. – 1931. – № 8/9. – С. 14–19; Праткоўскі У. Змаганне супраць нацыянальнага прыгнёту / У. Праткоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1932. – № 1–2. – С. 20–33; Корчык П. Вузлавы пункт нашай працы на вёсцы / У. Праткоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1931. – № 4. – С. 22–33; / У. Праткоўскі // Бальшавік Беларусі. Вынікі фашысцкай выбарчай кампаніі ў Зах. Беларусі / У. Праткоўскі // Бальшавік Беларусі. – 1931. – № 1–2. – С. 7–18.

30. Матэрыялы і дакументы : Пастановы і адозвы парт. і камс. арг. Зах. Беларусі // Інфарм. бюл. / Беларус. акад. навук, Каміс. Зах. Беларусі. – 1932. – № 5/6. – С. 117–133.

31. Міхнюк, У. Рыжскі мір і Беларусь / У. Міхнюк // XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў : матэрыялы беларус.-польск. навук. канф., Мінск, 20–21 лістапада 2000 г., / адк. рэд. У. Міхнюк, П. Гарнцарэк. – Мінск : БДУ, 2001. – С. 137–145.

32. Мятла, П. Аб Таварыстве беларускае школы і яго барацьбе / П. Мятла. – Менск : Беларус. Акад. навук, Каміс. па вывучэньні Заходняе Беларусі, 1932. – 34 с.

33. Некрашэвіч, А. Беларускі нацыянал-фашызм і нацыянал-дэмакратызм / А. Некрашэвіч. – Менск, 1929. – 18 с.; ён жа. Беларускі нацыянал-фашызм і яго сабрат беларускі нацыянал-дэмакратызм / А. Некрашэвіч // Бальшавік Беларусі. – 1929. – № 10-12. – С. 83–90.

34. Орехво, Н.С. Дела и люди КПЗБ: воспоминания / Н.С. Орехво. – Минск : Беларусь, 1983. – 287 с.

35. Пад польскім ярмом. – Менск : Бел. дзярж. выд-ва, 1929. – 23 с.

36. Перцаў, В. Барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сваё вызваленне ў перыяд польскай акупацыі (1921–1939 гг.) / В. Перцаў // Бальшавік Беларусі. – 1947. – № 12. – С. 30–38.

37. Пичета, В. Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии / В. Пичета. – М. : Московский рабочий, 1939. – 40 с.

38. Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине. – Минск : Изд-во Бел. Акад. наук, 1935. – 335 с.

39. Сталевіч, А. Беларускі нацыянал-фашызм. Яго вытокі, тэорыя і практыка / А. Сталевіч. – Менск : Бел. дзярж. выд-ва, 1930. – 88 с.

40. Сталевіч, А. Сялянскія партыі ў Заходняй Беларусі / А. Сталевіч // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 9. – С. 13–27, № 10. – С. 7–19, № 12. – С. 28–37; Сянкевіч А. Палітычныя групоўкі ў Заходняй Беларусі перад выбарамі ў Польскі сейм / А. Сянкевіч // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 1. – С. 15–19; Шнарскі, С. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі / С. Шнарскі // Бальшавік Беларусі. – 1928. – № 2. – С. 24–35.

41. Становішча рабочага класа на Заходняй Беларусі // Інфарм. бюл. / Беларус. акад. навук. Каміс. Зах. Беларусі. – 1932. – № 5/6. – С. 30–61; У лагеры фашызму // Інфарм. бюл. аб Зах. Беларусі. – 1933. – № 7. – С. 117–122 ; № 8. – С. 71–76; Фашысцкі тэрор // Інфарм. бюл. / Беларус. акад. навук. Каміс. Зах. Беларусі. – 1932. – № 5/6. – С. 62–102 ; 1933. – № 7. – С. 123–164, № 8. – С. 77–102; Гаспадарчае становішча Заходняй Беларусі // Інфарм. бюл. аб. Зах. Беларусі. – 1933. – № 7. – С. 11–34, № 8. – С. 14–21.

42. Тарашкевіч, Б. Заходняя Беларусь – пляцдарм імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі / Б. Тарашкевіч. – Менск : Беларус. акад. навук, Каміс. па вывучэнні Заходняе Беларусі, 1931. – 20 с.

43. Царюк, А.В. Революционное освободительное движение в Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) : автореф. дис. ... канд. ист. наук / А.В. Царюк ;Бел. гос. ун-т – Минск, 1954. – 22 с.

44. Шабсин, И. Как живут в Польше украинские и белорусские крестьяне / И. Шабсин. – М : Изд-во ЦК МОПР, 1926. – 15 с.

45. Шаўчук, І.І. Гуманітарныя навукі ў сацыяльнай гісторыі Беларусі (20–30-я гады ХХ ст.) : манаграфія / І.І. Шаўчук. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2007. – 279 с.

46. Шнейдэр, Я. Очерк размещения промышленности Западной Белоруссии / Я. Шнейдэр. – Мінск : Бел. АН, 1936. – 104 с.;

47. Шнейдэр, Я. Становішча сялянства Заходняй Беларусі / Я. Шнейдэр. – Мінск : Выд-ва. БелАН, 1935. – 15 с.

48. Якаўлеў, Л. Заходняя Беларусь / Л. Якаўлеў. – Менск : Бел. дзярж. выд-ва, 1931. –88 с.

***Savich A.A.* National liberation movement in Western Belarus in 1921–1939 in Byelarusian historiography of the 1920s–1950s.**

The article explores the research process of the national liberation movement in Western Belarus in 1921–1939 on the basic of historiographic sources. In this period, especialy in 1920s–1930s, historiography of the problem actively satisfied the necessities of the Bolshevik government besides solving scientific tasks and gradually submitted to the party-state machine. Therefore studying the guestions of national liberation movement had a rather schematic character. It dependent on the changing social and political situation in BSSR. In was also connected with the peculiar the national liberation movement, the soviet government's attitudes to Western- Belarusian problems and political repression's of historians and former participants of Byelarusian national liberation movement in Western Belarus.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 23.02.10

УДК 94(476) «1921/1939»

***В.М. Мярчук***

# ПРАЦОЎНАЯ ЭМІГРАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ФРАНЦЫЮ Ў 1920–1930-я гг.

У артыкуле акрэсліваецца заканадаўча-прававая база польска-французскіх эміграцыйных адносін, арганізацыйная структура і працэс афармлення эміграцыйнай дакументацыі, маштабы, дынаміка і сацыяльна-культурная адаптацыя рабочых-эмігрантаў у 20–30-я гг. XX ст. Аб'ектам дадзенага даследавання з'яўляюцца заходнебеларускія эмігранты, якія накіроўваліся ў гарады Францыі. У даследаванні падкрэсліваецца, што ў сувязі з зацікаўленасцю французскага рынку працы ў замежных рабочых і цяжкім сацыяльна-эканамічным становішчам заходнебеларускага насельніцтва ў 20–30-я гг. XX ст. распаўсюджваецца яго працоўная эміграцыя ў Францыю. У артыкуле зроблена выснова аб тым, што дзейнасць французскіх прадпрымальнікаў на працягу ўсяго міжваеннага перыяду адпавядала прынцыпам свабоднай эміграцыі. Для падтрымкі і распаўсюджання эміграцыйных плыняў уладамі абедзвюх краін былі распрацаваны эміграцыйныя канвенцыі і пагадненні, якія з'яўляліся асновай эміграцыі.

## Уводзіны

У 20–30-я гг. XX ст. на фоне сусветных эканамічных крызісаў набывае распаўсюджанне працоўная эміграцыя ў Францыю, эканоміка якой была зацікаўлена ў прытоку дадатковай рабочай сілы з розных краін свету. У выніку адкрытай эміграцыйнай палітыкі ў Францыі апынулася вялікая колькасць замежных рабочых, якія паклалі пачатак зараджэнню шматлікіх нацыянальных дыяспар. Нягледзячы на гістарычную і дэмаграфічную значнасць французскай эміграцыі, у беларускай і замежнай гістарыяграфіі не надавалася належнай увагі эміграцыйнай праблематыцы. У айчыннай гістарыяграфіі пакуль не існуе прац, у якіх акрэсліваліся б накіраванасць, змест і сутнасць працоўнай эміграцыі 20–30-х гг. XX ст. з тэрыторыі Заходняй Беларусі ў Францыю. Прадстаўнікі польскай гістарыяграфіі разглядалі дадзенае пытанне толькі ў агульным кантэксце эміграцыі з міжваеннай Польшчы, не вывучалі асаблівасці эміграцыяў з заходнебеларускіх зямель [1 – 4]. Таму мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца рэканструкцыя эміграцыйных працэсаў з Заходняй Беларусі ў Францыю ў 1920–1930-я гг. Навуковая навізна артыкула заключаецца ў тэматычнай накіраванасці працы. Упершыню праводзіцца аналіз працоўнай эміграцыі з заходнебеларускага рэгіёна ў Францыю, у навуковы ўжытак уводзіцца цэлы шэраг новых гістарычных крыніц.

## Польска-французская эміграцыйная палітыка

Працоўная эміграцыя ў Францыю – частка сусветнага эміграцыйнага працэсу, які атрымаў распаўсюджанне ў рамках заходнееўрапейскага напрамку эміграцыі ў 20–30 гг. XX ст. Францыя прываблівала эмігрантаў высокім жыццёвым узроўнем, магчымасцю атрымаць працу і заробак. Для каардынацыі і рэалізацыі эміграцыйных працэсаў дзяржаўныя ўлады Польшчы і Францыі распрацавалі шырокую заканадаўчую базу. Першым крокам супрацоўніцтва з'явіліся перагаворы ў Парыжы 3 верасня 1919 г., пасля якіх у Варшаве была падпісана польска-французская «Канвенцыя па справах

---

Навуковы кіраўнік – А.М. Вабішчэвіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна

эміграцыі і іміграцыі», якая паклала пачатак польска-французскім эміграцыйным адносінам і з'яўлялася галоўным эміграцыйным дакументам на працягу ўсяго міжваеннага перыяду. У аснову канвенцыі быў пакладзены прынцып свабоднай эміграцыі, аднак у выпадку складанага сацыяльна-эканамічнага становішча адной з краін дапускалася абмежаванне эміграцыйных плыняў.

У выніку польска-французскіх перагавораў 3 лютага 1925 г. у Парыжы былі вызначаны новыя аспекты эміграцыйнай палітыкі Францыі. Адным з галоўных вынікаў перагавораў з'явілася дамоўленасць, згодна з якой у выпадку прызнання французскімі дактарамі эміграната хворым яму не дазвалялася накіроўвацца да месца працаўладкавання. Калі праз пэўны час эмігрант не станавіўся працаздольным, то ён падлягаў рэпатрыяцыі: польскае консульства выдавала бясплатную візу і грошы на зваротны шлях.

Пасля польска-французскіх перагавораў 14 лістапада 1920 г. была вызначана сацыяльная праграма па абароне эмігрантаў, яе галоўныя моманты былі замацаваны ў «Канвенцыі па пытаннях дапамогі і сацыяльнай абароны». Польскія эмігранты па пытаннях сацыяльнага страхавання і бальнічных лістоў ураўнаваліся з французскімі рабочымі, а ў выніку бесперапыннай 15-гадовай працы ў Францыі ім выдзяляліся пенсійныя выплаты з фонду сацыяльнага страхавання [1, с. 65]. Пытанні сацыяльнага забеспячэння шахцёраў і работнікаў горназдабываючай прамысловасці акрэсліваліся ў «Канвенцыі сацыяльнага страхавання шахцёраў» ад 29 снежня 1929 г. [5, л. 2]. У 1935 г. Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Польшчы быў падрыхтаваны законапраект «Генеральнай канвенцыі сацыяльнага страхавання», аднак ён не атрымаў далейшага ажыццяўлення.

Актывізацыю эміграцыйных рухаў у 20–30 гг. XX ст. выклікала сітуацыя на рынку працы ў Францыі: кан'юнктура яе рынку была зацікаўлена ў замежнай працоўнай сіле, сярод якой прадстаўнікі польскай працоўнай эміграцыі сталі займаць значнае месца. Паводле афіцыйных даных французскіх статыстычных улад, у 1929 г. у Францыю іміграваала 179321 чалавек, з якіх 81508 (45%) складалі польскія эмігранты [6, с. 66–67].

Як сведчаць афіцыйныя звесткі Упраўлення статыстыкі працы Польшчы, з заходнебеларускага рэгіёна ў Францыю эміграваала ў 1927–1938 гг. 19380 чалавек, што складала 12,1% еўрапейскай эміграцыі і 6% ад агульнай колькасці польскіх эмігрантаў у Францыю (гл. табліцу 1) [7, с. 424–425].

Табліца 1 – Статыстычныя паказчыкі міжваенай эміграцыі (1927–1938 гг.).

| Эміграцыя / Тэрыторыя | **Эміграцыя ў Францыю (тыс. чалавек)** | **Эміграцыя ў еўрапейскія краіны (тыс. чалавек)** | **Агульная кол-ць эмігрантаў** |
|---|---|---|---|
| Заходняя Беларусь | 19380 | 111747 | 201480 |
| Польшча | 326628 | 918897 | 1320723 |

Заўвага – Табліца складзена паводле даных: Gawryszewski, A. : Ludność Polski w XX wieku. – Warszawa : Instytut Geografii i Przestrzennego Zagospodarowania im. Stanisława Leszczyńskiego PAN, 2005. – S. 424–425.

У канцы 1920-х гг. французская эканоміка знаходзілася ў складаным эканамічным становішчы, што выклікала рэзкае павелічэнне ўзроўню беспрацоўных і паніжэнне колькасці рабочых-імігрантаў. Так, у 1927–1928 гг. з тэрыторыі Навагрудскага ваяводства ў Францыю выехаў 151 чалавек, Віленскага – 420, Палескага ваяводства – толькі 38 чалавек (гл. табліцу 2) [8, с. 102–103].

Сусветны эканамічны крызіс, які ў 1929 г. ахапіў еўрапейскія краіны, у Францыі праявіўся толькі ў пачатку 1930-х гг., што прывяло да павелічэння колькасці польскіх

імігрантаў. Для прадухілення масавых эміграцыйных плыняў французскі ўрад вымушаны быў прыняць шэраг дэкрэтаў, якія мелі абмежавальны характар і выклікалі пашырэнне працэсу рээміграцыі [9, с. 232]. На працягу 1926–1937 гг. эміграцыя ў Францыю была найбольш пашырана ў Віленскім ваяводстве, з якога выехала 8429 чалавек (табліца 2).

Табліца 2 – Дынаміка эміграцыйных працэсаў з заходнебеларускага рэгіёна ў Францыю (1926–1937 гг.)

| Год / Ваяв-ва | 1926 | 1927 | 1928 | 1929 | 1930 | 1931 | 1932 | 1933 | 1934 | 1935 | 1936 | 1937 | Усяго ў 1926-1937 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Навагрудскае | 67 | 17 | 134 | 2023 | 976 | 79 | 24 | 51 | 14 | 1 | 38 | 88 | 3512 |
| Віленскае | 755 | 212 | 208 | 3230 | 2876 | 560 | 81 | 95 | 79 | | 63 | 261 | 8429 |
| Палескае | 36 | 5 | 33 | 31 | 195 | 22 | 7 | 13 | 7 | 0 | 17 | 22 | 388 |
| Усяго | - | - | 32145 | 81508 | 86500 | 28396 | 8133 | 11427 | 8028 | 1360 | 8373 | 33026 | 298896 |

Заўвага – Табліца складзена паводле даных: Kopeć, B. Wychodźtwo sezonowe z ziemi wileńskiej do Łótwy / B. Kopeć. – Wilno : Znicz, 1938. – 176 s.

У сярэдзіне 1930-х гг. у французскай эканоміцы адбылося паглыбленне крызісных з'яў, што выклікала дэпартацыю прамысловых рабочых з вялікім вопытам працы (10–15 гадоў). Рабочых датэрмінова звальнялі, не выплачвалі заработную плату, а ў некаторых выпадках эмігрантаў пакідалі без сродкаў на зваротны шлях. На сельскагаспадарчых рабочых не распаўсюджвалася прымусовае высяленне. Французская рээміграцыя была выклікана пашырэннем беспрацоўя ў краіне [10, с. 65].

У 1936 г. Народны фронт на чале з Альбертам Саро прыпыніў працэсы дэпартацыі замежных рабочых і палепшыў умовы працы імігрантаў. З прыходам у 1938 г. да ўлады ўрада Э. Даладзье аднавілася абмежавальная эміграцыйная палітыка. 2 мая 1938 г. быў выдадзены дэкрэт «Аб арганізацыі кантролю за замежнымі работнікамі» [11, л. 41].

Ва ўмовах набліжэння Другой сусветнай вайны эміграцыйная палітыка французскага ўрада набыла яскрава абмежавальны характар. У красавіку 1939 г. урад Э. Даладзье выдаў распараджэнне, якое абмяжоўвала грамадскія правы іншаземцаў: забаранялася арганізацыя грамадскіх аб'яднанняў, закрываліся газеты, падлягалі дэпартацыі рабочыя-эмігранты, якія ўдзельнічалі ў хваляваннях.

**Арганізацыйная структура эміграцыйных працэсаў і працэдура афармлення дакументаў**

У сувязі з тым, што міграцыйныя працэсы на пачатку 20-х гг. XX ст. пачалі набываць масавы характар, для іх ажыццяўлення на тэрыторыі Францыі і Польшчы была ўтворана шырокая арганізацыйна-структурная база. Згодна з умовамі «Канвенцыі па справах эміграцыі і іміграцыі», працэсамі набору эмігрантаў у Францыі займалася Дзяржаўнае ўпраўленне пасрэдніцтва працы. За дынамікай, структурай і колькаснымі паказчыкамі эміграцыйных працэсаў сачыла Генеральная французская канфедэрацыя працы. Яна каардынавала дзейнасць французскіх работадаўцаў, арганізоўвала эміграцыйныя перамяшчэнні, якія былі дадаткам да мясцовага рынку працы, забяспечвала сацыяльныя правы працоўных імігрантаў (8-гадзінны працоўны дзень, роўная аплата працы, платныя адпачынкі), а таксама ўдзельнічала ў ратыфікацыі міжнародных міграцыйных канвенцый і г.д. [12, с. 436].

У 1924 г. аб'яднанне французскіх прадпрымальнікаў утварыла Цэнтральнае эміграцыйнае таварыства («Societe generale d'Immigration»), якое займалася масавым наборам і транспарціроўкай замежных работнікаў і мела свае прадстаўніцтвы –

«Цэнтральны камітэт каменнавугальных шахт» («Comite Central des Houilleres de France») і «Цэнтральнае паштовае бюро сельскагаспадарчых работ» («Office Central de la mail – d'oeuvre agricole»). Аднак некаторыя французскія работадаўцы самастойна, без пасрэдніцтва Цэнтральнага эміграцыйнага таварыства, арганізоўвалі набор эмігрантаў. Так, напрыклад, Саюз рабочых жалезаздабываючых руднікоў праводзіў набор польскіх і італьянскіх работнікаў, закладваў для іх спецыяльнае пасяленне [6, с. 68]. Канкурэнцыю вышэйадзначаным арганізацыям складала «Federation des Employeurs de Main-d'Oeuvre Agricole de France», якая неаднаразова рабіла намаганні для атрымання дазволу на вярбоўку эмігрантаў у роўнай колькасці і на аднолькавых умовах з Цэнтральным эміграцыйным таварыствам [13, л. 40].

У 1927 г. было ўтворана польска-французскае земляробчае таварыства «Societe d'Expansion Agricole et Coloniale» («Agricolon»), якое ў мясцовасці Вілемур-сур-Тару (дэпартамент Гаўтэ Гароне) арганізавала сваё першае сельскагаспадарчае пасяленне [14, с. 199]. У справах сумеснай дзейнасці Каланізацыйны сектар Эміграцыйнага сіндыката супрацоўнічаў з «Impress Nacional» (Парыж), «Expansion Coloniale» (Парыж), «Каланізацыйнай уласнасцю» (Тулуза) [15, л. 31].

У 1925 г. паміж Польшчай і Францыяй была падпісана консульская канвенцыя, якая акрэслівала дзейнасць, абавязкі і функцыі консульскіх устаноў. На тэрыторыі Францыі дзейнічала восем польскіх консульстваў – у гарадах Парыж, Бардо, Гаўр, Ліль, Марсэль, Ніца, Страсбург і Ліен. Пры польскім пасольстве ў Парыжы дзейнічала Упраўленне эміграцыйнага саветніка, якое абараняла маральныя і матэрыяльныя інтарэсы эмігрантаў, пад кіраўніцтвам якога знаходзіліся ўсе польскія консульствы ў Францыі. Рэлігійная апека над эмігрантамі ажыццяўлялася 39 святарамі пад кіраўніцтвам Польскай каталіцкай місіі ў Парыжы [16, с. 92].

Працоўныя эмігранты падзяляліся на наступныя катэгорыі: мужчыны ад 21 да 40 гадоў, якія накіроўваліся на зямельныя, рудніковыя і прамысловыя працы; земляробы; жанчыны ва ўзросце ад 21 года (яны ў асноўным былі задзейнічаны ў земляробстве і ткацтве, павінны былі валодаць пісьмом і чытаннем); родныя і сваякі эмігрантаў [17, л. 11, 16].

Кантынгент эмігрантаў вызначаўся французскім бокам і залежаў ад кан'юнктуры і сітуацыі на рынку працы. Акрамя таго, колькасць плануемых французскім урадам рабочых рук залежала ад сезона. Сярод замежных эмігрантаў польскія рабочыя заўсёды былі запатрабаваны ў гэтай краіне, таму кожны месяц з тэрыторыі Польшчы выязджала па некалькі соцень працоўных людзей. Так, напрыклад, у ліпені 1925 г. запатрабаванасць польскіх рабочых складала 400 шахцёраў і 470 іх памочнікаў, а таксама 2100 сельскагаспадарчых работнікаў (пераважна жанчын). З тэрыторыі Заходняй Беларусі планавалася набраць: з Гродна – 10 памочнікаў шахцёраў і 130 сельскагаспадарчых работнікаў, з Баранавічаў – 10 памочнікаў шахцёраў і 50 сельскагаспадарчых работнікаў [18, с. 1]. У верасні 1925 г., калі палявыя работы былі закончаны, запатрабаванасць у польскіх рабочых была зніжана да 200 некваліфікаваных прамысловых работнікаў і 1500 земляробаў – з Заходняй Беларусі (Гродна) 40 некваліфікаваных работнікаў і 50 зямельных. У 1928 г. з Гродна рэкрутавалася 20 чалавек – 10 жанчын і 10 мужчын [19, с. 1].

Працэдура афармлення эміграцыйных дакументаў залежала ад віду працоўнай эміграцыі. Як правіла, сезонная, ці працоўная эміграцыя ў Францыю была калектыўнай і складалася з прадстаўнікоў беларускай, украінскай і часткова польскай нацыянальных груп, пастаянная эміграцыя была прадстаўлена польскім і яўрэйскім насельніцтвам. Эміграцыя падзялялася на калектыўную і індывідуальную. Першая ажыццяўлялася праз набор рабочых-эмігрантаў французскім Цэнтральным эміграцыйным таварыствам і яго прадстаўніцтвамі. Праезд эмігрантаў ажыццяўляўся за кошт французскіх

прадпрымальнікаў. Эмігранты ў пісьмовай форме павінны былі звярнуцца ва Упраўленне пасрэдніцтва працы, дзе ў вызначаны дзень у прысутнасці дэлегата французскай місіі адбывалася рэгістрацыя кандыдатаў на выезд. Затым эмігрантаў накіроўвалі да пунктаў збору ў Познані і Мыславіцах, дзе знаходзіліся прадстаўнікі французскай эміграцыйнай місіі і эміграцыйныя інспектары, якія выконвалі функцыі прадстаўнікоў французскага Эміграцыйнага ўрада. Так, напрыклад, праз зборны пункт Мыславіцы ў жніўні 1930 г. з Брэста выехала 59 чалавек (22 – на цукровыя заводы), у верасні – 58 чалавек, у кастрычніку – 18 чалавек (з якіх 16 работнікаў – на прамысловасць, 2 – шахцёры) [20, л. 60, 103, 105, 108].

Кошт дарогі работнікам аплачвалі работадаўцы, аднак яны мелі права з месячнага заробку адлічваць пэўную суму грошай, што з'яўлялася заручэннем ад разрыву кантракта з боку эмігранта. Родных эмігранта 60% ад кошту праезда аплачваў работадаўца, астатнія 40% – эмігрант з уласных сродкаў. Эмігранту дазвалялася бясплатна правозіць багаж да 30 кг, звыш нормы – за 1 кг багажу плацілі 1 польскі злоты [16, с. 32].

Індывідуальная эміграцыя ажыццяўлялася пры наяўнасці імянных запрашэнняў ад работадаўцаў і працоўных кантрактаў. Эміграцыйныя запрашэнні павінны былі быць адпаведнага ўзору і колеру: для вугальных шахт – сіняга, ля капальняў жалезнай руды – чырвонага, для прамысловасці – жоўтага, сельскай гаспадаркі – белага [21, с. 341]. Акрамя таго, ад эмігрантаў з запрашэннямі патрабавалася даведка аб іх матэрыяльным стане і абавязковае медыцынскае пасведчанне. Яно давала падставу для атрымання пасведчання на замежны пашпарт, якое выдавала староства. Консульскія візы эмігранты атрымлівалі ў французскім консульстве пры наяўнасці дакумента з Францыі і медыцынскага агляду, у 1929 г. французскія візы каштавалі 5 злотых. Пры індывідуальнай эміграцыі неабходны былі нямецкая (1 зл. 80 гр.), чэшская (2 зл. 65 гр.) і бельгійская (2 зл. 50 гр.) транзітныя візы, якія магчыма было атрымаць на мяжы [18, с. 25]. Праезд эмігрантаў ажыццяўляўся за ўласны кошт з 60-працэнтнай кампенсацыяй работадаўцам.

Нярэдка ў польскай прэсе публікаваліся аб'явы аб адкрыцці фабрык і заводаў на тэрыторыі Францыі, куды аб'яўляўся неабмежаваны набор рабочых-эмігрантаў. Кожнаму жадаючаму выехаць на працу неабходна было запоўніць фармуляр і далучыць да яго 40 злотых [22, с. 4]. Акрамя таго, працадаўцы свавольна пазбаўлялі эмігрантаў ідэнтыфікацыйных карт, тым самым не адбывалася замацаванне эмігрантаў за месцам працы. Неаднаразова правапарушэнні назіраліся з боку эміграцыйных пасрэднікаў. Самы яркі прыклад звязаны з аферай А. Манька, дырэктара турыстычнага бюро «Voyages France-Pologne» ў Парыжы, які за 1934–1938 гг. перавадной дзейнасці прысвоіў каля 80 тыс. франкаў. Падобныя сітуацыі назіраліся і ў іншых гарадах Францыі. Акрамя таго, нярэдка самі эмігранты былі заўважаны ў падробцы запрашэнняў, замежных пашпартоў, консульскіх віз і інш. У 1930-я гг. на тэрыторыі Палесся паліцыя раскрыла некалькі выпадкаў падробкі дакументаў. У сувязі з тым, што пры афармленні эміграцыйных дакументаў пачалі з'яўляцца фальшывыя візы, Эміграцыйнае ўпраўленне ў 1929 г. прыняло рашэнне аб непасрэднай дастаўцы візавых дакументаў Генеральнага консульства Польшчы ў Парыжы ва Упраўленне пасрэдніцтва працы.

Эміграцыйнае ўпраўленне ў красавіку 1929 г. вызначыла спіс французскіх фірм, якім забаранялася прадастаўляць эміграцыйныя паслугі: «Таварыства кавалёў у Арс-сюр-Мазэль» («Societe des Forges et Boulonneries d' Ars-sur-Moselle»), «Кампанія Леон Берг, Ленс, Арас-роуд» («Entreprise Leon Berge, Lens, Route d'Arras») (Па-дэ-Кале), «Кампанія шахцёраў у Кармо» («Societe des Mines des Carmaux») (Тарн), «Браты Савот і Альберт» («Savot Freres et Cie, Albert») (Сома) і інш. [23, л. 4].

У канцы 20 – пачатку 30-х гг. XX ст. на тэрыторыі Францыі дзейнічалі прыватныя фірмы, якія праводзілі агітацыю, набор польскіх землеробаў і рабочых, ажыццяўлялі пасрэдніцтва пры набыцці зямлі і маёнткаў у Францыі і продажы маёмасці ў Польшчы. Сярод такіх прадстаўніцтваў былі «Цэнтральнае сельскагаспадарчае агенцтва», «Польскае інфармацыйнае бюро» ў Ленсе, «Цэнтральнае інфармацыйна-гандлёвае агенцтва», «Зямельнае агенцтва Jean Pagua» і інш. Супрацоўнікамі Варшаўскага эміграцыйнага сіндыката было ўстаноўлена, што агенты дадзеных фірм заключалі фіктыўныя кантракты з эмігрантамі, прадстаўлялі няпоўную інфармацыю пра ўмовы працаўладкавання ў Францыі [24, л. 16, 87, 88]. Напрыклад, агенты фірмы «Agence Generale Agricole» Е. Шміта ў Ленсе заключалі фіктыўныя працоўныя кантракты з польскімі работнікамі з далейшай эміграцыяй у Францыю, затым разрывалі кантракт і забіралі на розных падставах грашовыя сродкі, пакідаючы эмігрантаў без сродкаў для існавання [20, л. 151]. Пры афармленні эміграцыйных дакументаў з французскага боку назіраліся неаднаразовыя злоўжыванні, якія асабліва праяўляліся падчас медыцынскіх аглядаў на зборных станцыях.

**Транспарціроўка і працаўладкаванне эмігрантаў**

Працэс транспарціроўкі рабочых-эмігрантаў ажыццяўляўся двума шляхамі – сухапутным (чыгункай) і марскім (караблямі). Падарожжа хуткім цягніком з польскай мяжы (Катавіцэ – Прага – Егер – Страсбург) займала двое сутак. Дарожны білет трэцяга класа ў такім цягніку каштаваў прыкладна 142 злотыя, на звычайныя цягнікі (3–5 сутак) – каля 100 злотых [25, л. 36].

Паслугі па марской транспарціроўцы эмігрантаў аказвала мараходнае таварыства «Compagnie Generale Transatlantique», прадстаўніцтвы якога знаходзіліся ў Варшаве і Гдыні. Падарожжа морам працягвалася тры дні і ажыццяўлялася праз порты Гдыня і Гаўр. Кошт праезду складаў каля 133 злотых, для дзяцей з 3 да 7 гадоў аплачвалася палова кошту білета, дзеці да 3 гадоў ехалі бясплатна [18, с. 27].

У 1931 г. Эміграцыйны сіндыкат разам з Польскім бюро падарожжа «Polexpress» у Парыжы пачаў арганізацыю спецыяльных рэйсаў для эмігрантаў у Францыю. Дадзенымі рэйсамі маглі карыстацца эмігранты, якія мелі імянныя запрашэнні, рээмігранты і турысты, якія накіроўваліся ў Францыю. Ім прадастаўляліся льготны дарожны білет і бясплатная дапамога Эміграцыйнага сіндыката пры афармленні дакументаў і візавых папер, а таксама транспарціроўка эмігрантаў пад канвоем у спецыяльных вагонах.

Асноўнымі сферамі дзейнасці працоўных эмігрантаў з заходнебеларускага рэгіёна з’яўлялася праца на прамысловых прадпрыемствах, здабываючых работах і ў сельскай гаспадарцы. Узрост эмігранта мог вар’іравацца у залежнасці ад фізічнага здароўя і сілы чалавека. У 1926 г. у Францыі каля 140000 рабочых-эмігрантаў (58%) былі задзейнічаны ў здабываючай і жалезаруднай прамысловасці, дзе сярэдняя дзённая заработная плата складала 17–25 франкаў. Колькасць эмігрантаў і іх родных, занятых у сельскай гаспадарцы ў 1926 г., складала 45000 чалавек (19%). Заработная плата землеробаў вагалася ад 150 да 175 франкаў штомесячна (дадаткова вызначалася ўтрыманне) ці 300 франкаў без утрымання [26, с. 7]. Праца ў сельскай мясцовасці была менш папулярнай сярод эмігрантаў і лічылася горшай, чым у прамысловасці. У сувязі з гэтым 30 лістапада 1926 г. Міністэрства ўнутраных спраў Францыі выдала загад аб сельскагаспадарчых эмігрантах, якім забаранялася самавольна пакідаць месца працы і ўладкоўвацца на прамысловых прадпрыемствах. Акрамя таго, работадаўцы нярэдка забіралі асабістыя дакументы ў эмігрантаў, тым самым прадухіляючы спробы пошукаў новага месца працы на прамысловых прадпрыемствах.

Найбольш кампактнае пасяленне прадстаўнікоў заходнебеларускага

насельніцтва ў Францыі назіралася ў паўночных дэпартаментах – Па-дэ-Кале, Норд, Эльзас і Латарынгія, Парыжскі округ, Пікардзія. На тэрыторыі паўночнай Францыі эмігранты асвойвалі прафесіі металургічнай, будаўнічай, броварскай, тэкстыльнай, цагельнай і здабываючай прамысловасці. Вялікая колькасць эмігрантаў працаўладкоўвалася на цукровых заводах у правінцыях Барэн, Вас'ён, Шато Т'еры, Лізісюр-уорк. Заработная плата на такіх прадпрыемствах складала каля 30–50 франкаў у дзень [27, л. 7].

На тэрыторыі паўднёва-заходняй Францыі атрымала распаўсюджанне іміграцыйнае земляробства. Сярод сельскагаспадарчых імігрантаў магчыма вылучыць наступныя катэгорыі земляробаў: здольшчыкі, арэндатары, зямельныя работнікі і ўласнікі. Найбольш распаўсюджанымі формамі земляробства з'яўляліся здольшчына і арэнда [28, л. 241, 245]. У дэпартаментах Хатэ В'ена, Ло і Гарона, Шаранта Інтэра і інш. (паўднёвая і сярэдняя Францыя) распаўсюджанне атрымала здача дзяржаўных зямельных гаспадарак у арэнду [29, с. 3].

Пытанні жыллёвага забеспячэння эмігрантаў, як і ўмоў іх працы, насілі востры характар. Нярэдка назіраліся такія сітуацыі, калі замест жыллёвага памяшкання для сельскагаспадарчых рабочых адводзіліся стайні. У 1927 і 1932 гг. французскі ўрад намагаўся па палепшыць ўмовы пражывання замежных сельскагаспадарчых рабочых, аднак на практыцы прадпрымальнікі вельмі рэдка рабілі крокі ў дадзеным накірунку [30, л. 9]. Для абароны сацыяльных правоў польскіх рабочых-эмігрантаў у 1924 г. былі ўведзены пасады кантралёраў, якія павінны былі валодаць польскай мовай і ведаць звычаі работнікаў. Галоўны абавязак такіх кантралёраў заключаўся ў надзоры за выкананнем умоў працоўных кантрактаў [31, с. 2]. У 1930 г. у Тулузе быў створаны Саюз польскіх земляробаў, які налічваў каля 400 чалавек. Ён займаўся сацыяльна-эканамічнымі пытаннямі дзейнасці эмігрантаў і ўдзельнічаў у культурна-асветніцкім жыцці сельскагаспадарчых эмігрантаў [32, л. 102].

Прадстаўнікамі заходнебеларускай працоўнай эміграцыі ў Францыі былі ў асноўным катэгорыі працоўных слаёў грамадства, якія мелі нізкі ўзровень адукацыі. Нешматлікая частка эмігрантаў беларускай інтэлігенцыі ў асноўным атаясамлівала сябе з палякамі. Таму ў пачатку 20-х гг. ХХ ст. гаварыць аб заходнебеларускай грамадска-асветніцкай і культурнай дзейнасці не прыходзіцца. Толькі ў канцы 20-х гадоў сярод беларускіх эміграцыйных колаў пачаў узнікаць арганізацыйны рух. Да гэтага часу існавалі толькі некалькі невялічкіх гурткоў і арганізацый у Эльзасе, Латарынгіі, на поўначы і поўдні Францыі. Яны не ставілі перад сабой пэўных мэтаў, мелі выключна сяброўска-сямейны характар. У 1927–1928 гг. у Біянкуры дзейнічаў беларускі гурток, які быў арганізаваны працаўніком фабрыкі «Рэно» па прозвішчы Сарока і налічваў каля 50 чалавек. Аднак дадзены гурток не меў афіцыйнага статусу. Пачаткам самастойнага арганізаванага руху беларускай працоўнай эміграцыі ў Францыі можна лічыць снежань 1930 г., калі быў заснаваны «Хаўрус» – культурна-асветніцкая арганізацыя беларускіх работнікаў, якая атрымала юрыдычныя правы адкрываць свае аддзяленні на ўсёй тэрыторыі Францыі [33, с. 174].

**Заключэнне**

У 20–30-х гг. ХХ ст. на тэрыторыі заходнебеларускага рэгіёна вядучым напрамкам кантынентальнай эміграцыі з'яўляўся выезд у Францыю. Французская эканоміка была зацікаўлена ў прытоку замежных рабочых, што абумовіла рэкордны рост ўзроўню імігрантаў. Найбольшымі нацыянальнымі іміграцыйнымі групамі Францыі з'яўляліся палякі, італьянцы і іспанцы. Працэсамі каардынацыі іміграцыйных плыняў займалася Генеральная французская канфедэрацыя працы, якая ажыццяўляла кантроль за маштабамі, дынамікай і структурай іміграцыі. Для ажыццяўлення

пасрэдніцкай дзейнасці ў 1924 г. было ўтворана прыватнае аб'яднанне французскіх работадаўцаў «Цэнтральнае эміграцыйнае таварыства», якое займалася масавым наборам і транспарціроўкай замежных работнікаў. Эміграцыя ў Францыю была калектыўнай, калі прадстаўнікі французскіх фірм праводзілі масавы набор польскіх работнікаў і арганізоўвалі іх транспарціроўку, і індывідуальнай – эмігранты самастойна на падставе запрашэнняў ці працоўных кантрактаў афармлялі эміграцыйныя дакументы і накіроўваліся ў Францыю. Найбольш кампактнае працаўладкаванне заходнебеларускіх эмігрантаў назіралася ў паўночных дэпартаментах Францыі – Па-дэ-Кале, Нордзе, Эльзасе і Латарынгіі, Пікардзіі, Парыжскай акрузе. Асноўнымі сферамі дзейнасці эмігрантаў былі праца на прамысловых прадпрыемствах і сельскагаспадарчыя работы. Умовы працы і жыцця эмігрантаў не заўсёды адпавядалі санітарна-гігіенічным нормам, што неаднаразова вымушала іх мяняць месца працы, нягледзячы на пратэсты работадаўцаў і заканадаўчыя нормы эміграцыі. Культурна-асветніцкая дзейнасць заходнебеларускіх эмігрантаў да канца1920-х гг. развівалася ў кантэксце польскай дыяспары, толькі ў пачатку 1930-х гг. яна набыла рысы самастойнасці.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Janowska, H. Polska emigracja zarobkowa we Francji w latach 1919–1939 / H. Janowska. – Warszawa, 1964. – 267 s.
2. Kołodziej, E. Dzieje Polonii w zarysie 1918–1939 / E. Kołodziej. – Warszawa, 1991. – 336 s.
3. Niemyska-Hessen, M. Reemigracja z Francji w dobie kryzysu / M. Niemyska-Hessen. – Warszawa : Wydawnictwo Instytutu Gospodarstwa Społecznego, 1939. – 84 s.
4. Rozwadowski, J. Emigracja polska we Francji / J. Rozwadowski. – Lille : Wydawnictwo Polskiego Uniwersytetu Robotniczego we Francji, 1927. – 202 s.
5. AAN. – Zespół MSZ. – Sygn. 9664. Польска-французская дарадчая камісія ў эміграцыйных справах. Перагаворы ў справах набору, транспарціроўкі, умоў побыту і працы польскіх работнікаў. Рапарты, пратаколы, нататкі, мапы, праект, інструкцыя (1935, 1939 гг.).
6. Wertheim, B. Pracodawcy i pracownicy a współczesne zagadnienie migracyjne w latach 1919–1931 / B. Wertheim. – Warszawa : Biblioteka prawnicza, 1934. – 105 s.
7. Gawryszewski, A. Ludność Polski w XX wieku / A. Gawryszewski. – Warszawa : Instytut Geografii i Przestrzennego Zagospodarowania im. Stanisława Leszczyńskiego PAN, 2005 r. – 622 s.
8. Kopeć, B. Wychodztwo sezonowe z ziemi wileńskiej do Łótwy / B. Kopeć. – Wilno : Znicz, 1938. – 176 s.
9. Cheimicki, T. Powrut wychodźców z Francji w latach 1935 i 1936 // Statystyka Pracy: Wydawnictwo Głownego Urzedu Statystycznego, 1937. – S. 232–235.
10. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (далей ДАГВ). – Фонд. 541. – Воп. 1. – Спр. 277. Дакументы аб выдачы дазволу на выезд за мяжу (пратаколы, заявы, пасведчанні, даведкі і інш.). 1923 г.
11. ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 44. Цыркуляры эміграцыйнага сіндыкату аб афармленні дакументаў і эміграцыі ў Францыю і Бельгію; спісы эмігрантаў.
12. Sukiennicki, H. Obrona interesów zawodowych emigranta polskiego we Francji / H. Sukiennicki // Kwartalnik Instytutu naukowego do badań emigracji i kolonizacji.– Warszawa: Wydawnictwo Polskiego Towarzystwa Emigracyjnego, 1928.– T. 2–3. – S. 436–446.

13. AAN. – Zespół MSZ. – Sygn. 9663. Польска-французская дарадчая камісія ў эміграцыйных справах. Перагаворы ў справах набору, транспарціроўкі, умоў побыту і працы польскіх работнікаў. Рапарты, пратаколы, нататкі, мапы, праект, інструкцыя (1939 г.).

14. Klinowicz, S. Kronika zagraniczna z Francji / S. Klinowicz // Kwartalnik Instytutu naukowego do badań emigracji i kolonizacji.– Warszawa : Wydawnictwo Polskiego Towarzystwa Emigracyjnego, 1927.– T. 3. – S. 192–200.

15. AAN. – Zespół MSZ. – Sygn. 9578. Палажэнні польскай эміграцыйна-асадніцкай палітыкі. Арганізацыя эмігрантаў. Пратаколы, рапарты, нататкі, карты (1934, 1935 гг.).

16. Wskazówki dla wychodztwa do Francji (Mała biblioteka emigranta polskiego № 1). – Warszawa, 1929. – 96 s.

17. ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 9. Цыркуляры і ўказанні эміграцыйнага сіндыката аб эміграцыі ў Аргенціну і Бразілію.

18. Wychodztwo. – 1925. – № 26.

19. Wychodztwo. – 1925. – № 36.

20. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1542. Цыркуляры палескага ваяводы, бюлетэні Варшаўскага эміграцыйнага сіндыката, справаздачы аб дзейнасці Познаньскага эміграцыйнага сіндыката за 1929 г., спісы эмігрантаў.

21. Качараба, С.П. Еміграція з Західної України. 1919-1939 гг. : автореф. дис. … докт. істор. наук : 07.00.02 / С.П. Качараба ; НАН Украіни, Ін-т українознавства ім. І. Крип’якевича. – Львів, 2003. – 31 с.

22. Wiadomości dla emigrantow. – Warszawa, 1934. – 10 marca.

23. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1539. Цыркуляры Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, спісы бежанцаў з СССР.

24. ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 1335. Цыркуляры і распараджэні эміграцыйнага сіндыкату, справаздачы яўрэйскіх таварystваў; спісы эмігрантаў.

25. ДАБВ. – Фонд 2082. – Воп. 1. – Спр. 8. Цыркуляры эміграцыйнага сіндыката аб парадку эміграцыі ў розныя краіны Паўднёвай Амерыкі. 1936–1939 гг.

26. Wychodztwo. – 1926. – № 17.

27. ДАГВ. – Фонд 541. – Воп. 1. – Спр. 263. Дакументы аб выдачы дазвола на выезд за мяжу (пратаколы, заявы, пасведчанне, даведкі і інш.). 1922–1923 гг.

28. AAN. – Zespół MSZ. – Sygn. 9577. Палажэнні польскай эміграцыйна-асадніцкай палітыкі. Арганізацыя эмігрантаў. Пратаколы, рапарты, нататкі, карты (1928, 1934, 1935 гг.).

29. Wychodztwo. – 1927. – № 6.

30. ДАГВ. – Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 308. Перапіска з французскім консульствам аб легалізацыі дакументаў.

31. Wychodztwo. – 1925. – № 27.

32. AAN. – Zespół MSZ. – Sygn. 9580. Планы аб эміграцыйна-каланізацыйнай палітыцы і арганізацыі эмігрантаў. Справаздачы Міністэрства замежных спраў, мемарандумы, нататкі (1933, 1935 гг.).

33. Папоўская, Т. Беларуская эміграцыя міжваеннага перыяду ў Францыі і Аргенціне / Т. Папоўская // Беларуска-Albaruthenica: Кн. 2. / рэд. А. Анціпенка [і інш.]. – Мінск : Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны, 1993. – С. 173–180.

***Miarchuk V.M.*** **Labour emigration of population of West Belarusian lands to France in 1920–1930ies.**

The article outlines legislative and legal base of Polish-Belarusian emigration relations, its organizational structure and the process of drawing up emigration documents, the scale, dynamics and social and cultural adaptation of emigrant workers in the 20–30s of XXth. The subject of this research are West Belarusian emigrants, who headed for cities of France. The research underlines that of interest of the French market in work of foreign workers and hard social and economic status of West Belarusian population in the 20–30s of the XXth century their labour emigration to France becomes widespread. The article includes a conclusion that activities of French entrepreneurs during the whole interwar period complied with the principles of free emigration. For supporting and widening of emigration flows the authorities of the two countries drew up emigration conventions and agreements, which were a basis for emigration.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 28.04.10

УДК 101 : 36 + 124.5

*П.П. Можейко*

# ХРИСТИАНСКОЕ ПОНИМАНИЕ ВНУТРЕННЕГО МИРА ЧЕЛОВЕКА КАК ФАКТОР СТАНОВЛЕНИЯ БАЗИСНЫХ ЦЕННОСТЕЙ ТЕХНОГЕННОГО ОБЩЕСТВА

Статья посвящена философскому осмыслению идеалов раннего христианства как одногоиз факторов генезиса социокультурных ценностей техногенного общества. Необходимость обращения к истокам базисных ценностей этого общества обусловлена актуальностью данной проблематики в современной философской аксиологии. В статье особое внимание уделено анализу идеалов раннего христианства при исследовании внутреннего мира человека.

## Введение

В последнее время принципиально новую роль в процессе взаимодействия разных культур и цивилизаций играют мировые религии. Влияние религиозных установок на становление базисных ценностей социума может носить как конструктивный характер, задав человечеству новое духовное измерение, предложив социокультурные механизмы взаимодействия разных стран в XXI веке, так и негативный, акцентировав несовпадение аксиологических установок разных религий, культур и цивилизаций.

Христианские идеалы интересны потому, что на протяжении двух тысяч лет они играют важную роль в развитии культуры. Их теоретическая реконструкция и исследование «встроенности» в социокультурную парадигму техногенного общества теоретически насущны и практически востребованны. Исследование генезиса идеалов раннего христианства как одного из формообразующих элементов социокультурных ценностей техногенного общества имеет самое непосредственное отношение к проблеме осознания его современного состояния. Это способствует прояснению причин кризисных явлений в культуре данного общества и поиску путей их локализации и преодоления. Важнейшее значение для исследования социокультурных ценностей техногенного общества обретает обращение к проблеме субъективации, к факторам осмысления человеком своего «Я». С точки зрения христианского религиозно-философского сознания, любая умозрительная проблема, в том числе и познание Бога, имеет своей предпосылкой и исходным началом самосознание человека, его внутренний мир [1, с. 61].

Христианство обратило внимание на одну из главных особенностей человека: он одновременно живёт в двух мирах – в мире внешнем и мире внутреннем. И если первой составляющей жизни человека было уделено достаточно много внимания античными мыслителями, то вторая практически находилась за скобками их философского дискурса. Для мыслителей эпохи патристики вся вселенная сосредоточена между двумя полюсами – Богом и человеком. Человек – главное и любимое творение Бога. Забота о нем составляет основную задачу божественных поступков и помыслов, считают христианские богословы.

Ещё одна сторона учения о человеке, которую открыло христианство, – это область души, поэтому человек и сам стал пристальнее всматриваться в себя. А. Тойнби замечает по этому поводу: «...высшие религии – тот единственный путь жизни, который способен вывести человека к таким горизонтам, что он сможет познать истинные проблемы души, осуществить поиск истины и выбрать направление для достижения духовной цели» [2, с. 217].

Каждый человек наделён Богом неповторимой телесной структурой. Но также каждый человек наделён и неповторимой душой. Поэтому важнейшей чертой челове-

ка, с точки зрения христианства, становится постоянное обращение к собственному духовному миру, непрерывное сопряжение собственных замыслов и внутренних побуждений с евангельскими заповедями. «Царство Божие внутри вас есть» [3, с. 87]. Вследствие этого, на взгляд христианских идеологов, в своей духовной жизни для человека важно не терять своей личности, своей внутренней неповторимости [3, с. 254].

Христианство требует от человека внимательно вслушиваться в самого себя, соизмеряя свои поступки с голосом совести и своим высоким предназначением. Тем самым оно создаёт и обосновывает новые ценности человеческого бытия, нестандартно интерпретируя одну из установок античной философии: «Человек есть мера всех вещей» [4, с. 68].

Переход из пространства внешнего мира во внутреннее «пространство» человеческого духа – одна из основных установок христианской религии. Она выражена знаменитой фразой Августина Аврелия в его работе «Об истинной религии»: «Не блуждай вне, вернись к самому себе, ибо истина обитает во внутреннем человеке» [5, с. 347].

Обосновав религиозным авторитетом внимание человека к своей личности, христианство призывает человека быть человеколюбивым, утверждая, что совесть является одной из основных его характеристик. Само понятие совести не являлось установкой античной культуры. Большинство людей того времени просто не рефлексировало над тем, что это такое. Только христианская религия впервые в истории сознательно подняла голос в защиту «униженного, оскорблённого», «маленького человека». Её адепты теоретически аргументируют и доказывают, что человек должен быть прежде всего гуманным. Безусловно, и раньше человек искал духовные идеалы. «Проблема поиска духовных идеалов была для человека и человечества одной из наиболее важных и актуальных задач» [6, с. 223]. Но христианство задаёт совсем другой вектор этим поискам. Сложно себе представить больший переворот в нравственности поздней античности, чем притчу о добром самаритянине, изложенную в Евангелии, в которой обосновывается гуманизм по отношению не только к своим соплеменникам, но и ко всему человечеству [3, с. 78].

Переход от античного «космоцентризма» к христианской антропологии и сопровождавшая его «переоценка ценностей» включали в себя пересмотр воззрений на сущность и предназначение человека. «Горизонт науки ограничен рамками природы, горизонт идеологии – рамками общественной жизни, но человеческую душу невозможно заключить в какие-нибудь из этих рамок», – замечает по этому поводу А. Тойнби [2, с. 217].

Внутренние противоречия индивида и его душевные конфликты рождают конфликты внешние, втягивают человека, а с ним и человечество в цепь трагических противоречий, утверждают средневековые философы. Изучение мира внутреннего помогает постигать мир внешний. Другими словами, наличествующая в сознании картина мира формируется не только в результате отражения внешней реальности, но и за счет собственной активности сознания. Конкретными механизмами реализации данной особенности сознания могут выступать, например, такие когнитивные свойства, характерные для научной рациональности, как возможность создавать концепты, не имеющие реальной основы, но способствующие ассоциативному мышлению.

Названные свойства позволяют заключить, что «взгляд внутрь себя», помимо экзистенциальной функции, несет в себе также функцию проекции содержания внутреннего мира на окружающую действительность. Тем самым утверждается новое качество человека – внешняя свобода определяется свободой внутренней. Важнейшим фактором прогресса средневекового общества становится уже не только допускаемая, но в значительной мере поощряемая и даже культивируемая христианством личная, экономическая и социальная свобода.

Эта нравственная амбивалентность, во многом характерная также и для всей средневековой философии, с одной стороны, способствовала появлению ценностной установки свободно принимать решения, с другой – соизмерять свои поступки с социальными нормами. Новый характер нравственности проявляется ещё и в том, что все её добродетели и императивы, каким бы ни был их объект, вытекают из внутреннего мира человека.

В средневековой философии, в связи с рассмотрением комплекса вопросов о соотношении свободной воли, предопределения и благодати, то есть проблематики, задаваемой, в частности, драматическими дилеммами между «упреждающим» будущее предопределением и устремленным в будущее свободным конструированием социальной среды утверждался статус свободной воли.

Свобода – свойство воли, утверждало христианство, а не свойство разума, как ее понимали античные философы. Так христианством разрешается парадокс Сократа о возможности понимать благо и все же творить зло [4, с. 85]. Разум принимает, но воля отвергает благо, поскольку она, хотя и принадлежит человеческому духу, имеет свою автономию, образуя оппозицию разуму. Разум познает, но выбирает воля: ее выбор может быть иррациональным, не имеющим разумного обоснования. Воля вместе с разумом, становится стержневой характеристикой человека. Если в античности центр этики составляло знание, то в средние века появляется новая ярко выраженная тенденция – перенести основу этики из знания в веру, из разума в волю, из внешнего мира в мир внутренний [3, с. 194].

Важнейшим элементом мировоззрения раннего христианства выступает понятие «внутренний человек». Апологеты утверждают, что рождение личности возможно исключительно её собственными усилиями, внутренними установками, которые не возникают случайно, а формируются в процессе приобщения к культуре [7, с. 135]. Можно утверждать, что христианская культура вводит человека в духовный строй, в котором происходит его самопонимание, осознание того, что изменение мира возможно только и, прежде всего, как результат внутреннего изменения самого себя.

С христианской точки зрения, предназначение человека включает совершенствование, улучшение, очищение не только своего внутреннего духовного мира, но и мира материального. Такие наивные, на первый взгляд, обращения христианской религии к каждому человеку имели далеко идущие последствия, оказав существенное влияние на становление ценностных установок не только средневековой, но и современной Европы.

В средневековой культуре появляется своеобразный способ исследования своего «Я» – исповедь. Это определенный вид духовного творчества, когда объектом рефлексии становится не человеческий индивидуум, а личность самого исповедующегося, что стимулирует умение совершать самоанализ, нравственный самоотчёт. Тем самым внешние способы церковной регламентации заменялись гораздо более действенными формами самоконтроля. Данный акт стал важнейшим этапом на пути формирования европейского индивида со всеми его достоинствами и недостатками и послужил своеобразным фундаментом для экспликации проблематики совести [8, с. 151].

«Исповедь» Августина Аврелия – это первый опыт всеобъемлющего самоанализа в христианстве, осуществляемого не через сопоставление человека и окружающей действительности, а через сопоставление его с Богом (этическим идеалом), с одной стороны, и посредством проникновения в глубины собственного «Я» – с другой. Диалог человека с Богом Августин Аврелий делает инструментом самопознания, попыткой исследования своего сложного внутреннего мира. Основополагающим вопросом «Исповеди» Августина становится вопрос о сущности человека и его предназначения. Этот «вечный» вопрос он пытается решить не абстрактно, не вообще о человеке, а вполне конкретно: это проблема конкретного «Я», человека как неповторимой индиви-

дуальности. «Стал я сам для себя великой загадкой и спрашивал душу свою, почему она так печальна и почему так смущает меня, и не знала она, что ответить мне», – говорит христианский апологет [9, с. 60].

Утилитарное обоснование обязанности человека делать добро другим, а также и внешний юридический характер этой обязанности в философии долга устраняется, и эта обязанность выводится из самого человека как выражение его нравственной природы. Человек должен делать добро не затем, чтобы обязывать благодарностью себе, а затем, чтобы раскрыть свою нравственную природу. Индикатором такого нравственного совершенства личности является бескорыстное служение людям. «Христианство привносит в историю европейской этики осознание бездонных глубин человеческого существа, так как полагает в его основании изначальную антиномичность между тем, что я хочу, и тем, что я реально делаю» [8, с. 151].

Христианство акцентирует внимание на том, что познание своего внутреннего мира в определенном смысле есть припоминание на основе собственного опыта, хотя сам процесс мышления и невозможно понять. Схожую мысль затем высказывает Риккерт: «Механизм нашего мышления нам совершенно не известен. Мы только можем указать на три факта мышления: 1) символ; 2) ассоциации; 3) слово, которое само по себе относится к динамической символической системе» [10, с. 334].

Техногенное общество во многом ориентировано на индивидуальность человека, где его бытийствование и долженствование проверяется «внутренним камертоном». Такая установка впервые появляется в раннехристианской аксиологии. Христианство утверждает, что сущность личности реализуется не в полисе или государстве, она открывается во внутреннем мире человека и доступна каждому вне зависимости от происхождения и интеллектуальных способностей. Отсюда вытекает следующий тезис: личность несет ответственность за свои слова и поступки не только перед Богом, но также и перед обществом.

Таким образом, в средневековой философии история самосознания разворачивается как история души, история познания самого себя и познания Бога, как путь самосовершенствования личности. Наработанное в средневековье умение человека обращать внимание на свой внутренний мир стало одним из оснований социокультурных ценностей техногенного общества. Все это указывает на переход к более высокой ступени самосознания личности, когда возрастает самоконтроль и увеличивается ответственность в деятельной сфере. Между личностью и сферой деятельности был «встроен» своеобразный аппарат самоконтроля, получивший дальнейшее развитие в «этике ответственности», характерной для техногенного общества.

**Заключение**

Христианство создает свою, непохожую ни на какую другую, антропологию: человек через Логос причастен Богу и поэтому двуедин: он ноуменально-феноменален. Душа и сущность человека – ноуменальны, но его социальное бытие – феноменально. Христианские мыслители впервые взглянули на жизнь человечества как на целостный исторический процесс. Средневековая философия впервые рассматривает человека как личность, которая обладает внутренней свободой, реализующейся в самостоятельно мотивированных поступках, и несет ответственность за их результат.

СПИСОК ЛИТЕРАТУРЫ

1. Делёз, Ж. Что такое философия? / Ж. Делёз, Ф. Гваттари. – СПб. : Алетейя, 1998. – 288 с.

2. Тойнби, А. Дж. Цивилизация перед судом истории : сборник / А.Дж. Тойнби. – М. : Рольф, 2002. – 592 с.

3. Библия. Минск, PICORP, 1996. – 294 с.

4. Асмус, В.Ф. Античная философия / В.Ф. Асмус. – М. : Высшая школа, 1998. – 400 с.

5. Августин, Б. Об истинной религии. Учитель / Б. Августин. – М. : АСТ, 2003. – 440 с.

6. Журавель, В.В. В поиске духовных идеалов: духовная культура человека / В.В. Журавель // Минск, Неман. – 2001. – № 5.– с. 223–245.

7. Гарсия, Д. О понятиях «культура» и «цивилизация» / Д. Гарсия // Вопросы философии. – 2002. – № 12. – С. 228–234.

8. Душин, О.Э. Модели совести: Фома Аквинский и Владимир Соловьёв / О.Э. Душин // Вопросы философии. – 2005. – № 3. – С. 149–151.

9. Августин Блаженный. Избранные произведения. Исповедь / Августин Блаженный – М. : изд-во Сретенского монастыря, 2006. – 320 с.

10. Риккерт, Г. Науки о природе и науки о культуре / Г. Риккерт. – М. : Республика, 1998. – 413 с.

***Mozhejko P.P.*** **Christian understanding of the private world of the person as the factor of becoming of basic values technogenic of the society**

The article is devoted to philosophical judgement of ideals of early christianity as one genesis from factors socialcultural values technogenic societies. Necessity of the reference to sources of basic values of this society is caused by a urgency of the given problematics in modern philosophical axiological. In clause the special attention is given the analysis of ideals of early christianity at research of a private world of the person.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 02.12.09

УДК 94 (476-15) «1926/1936»

*К.С. Разуванава*

# ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА ІНСТЫТУТА ГАСПАДАРКІ І КУЛЬТУРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА (1926–1936 гг.)

Артыкул прысвечаны гісторыі стварэння і дзейнасці лакальных арганізацый Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры на тэрыторыі Палескага ваяводства ў міжваенны перыяд. У артыкуле аналізуюцца асноўныя праблемы і асаблівасці дзейнасці інстытута ў рэгіёне, а таксама разглядаецца сацыяльны склад гурткоў арганізацыі ў кантэксце асаблівасцей самога рэгіёна. Акрамя характарыстыкі адносін польскіх мясцовых уладаў да дзейнасці арганізацыі, адзначаюцца прычыны слабасці яе ўплыву ў рэгіёне, а таксама ўзнімаецца пытанне аб прыналежнасці мясцовых гаспадарчых аб’яднанняў да інстытута і праблема іх вызначэння.

## Уводзіны

Гісторыя дзейнасці Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК) як адной з найбольш значных культурна-асветных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд да гэтага часу застаецца маладаследавана праблемай. Нягледзячы на шматлікія архіўныя матэрыялы (фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўных архіваў Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна, Беларускага Дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа), значную колькасць перыядычных выданняў, што захаваліся з тых часоў і падаюць даволі яснае ўяўленне аб спецыфіцы і асноўных кірунках дзейнасці дадзенай установы, на сённяшні дзень існуюць толькі асобныя працы, прысвечаныя гэтай праблеме (у асноўным гэта даследаванні польскіх навукоўцаў) [1; 2]. Што ж датычыцца прац па гісторыі ўзнікнення і дзейнасці асобных рэгіянальных структур інстытута, то тут давядзецца адзначыць імя толькі аднаго беларускага даследчыка – А.Ф. Вашкевіча, чые артыкулы прысвечаны асвятленню найбольш яскравых фактаў дзейнасці асобных рэгіянальных структур Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў цэлым [3; 4].

Багаты матэрыял архіўных фондаў, а таксама інфармацыя, змешчаная на старонках тагачасных перыядычных выданняў, дазваляюць разгледзець асаблівасці дзейнасці БІГіК на тэрыторыі Палескага ваяводства шляхам даследавання наступных праблем:

- спецыфіка адукацыйнай палітыкі польскай адміністрацыі ў дачыненні да беларускай нацыянальнай меншасці і яе ўплыў на асаблівасці развіцця культурна-асветных працэсаў на тэрыторыі рэгіёна;
- асаблівасці ўзнікнення і дзейнасці гурткоў БІГіК на тэрыторыі Палескага ваяводства;
- праблема вызначэння прыналежнасці кааператыўных гаспадарчых арганізацый рэгіёна да БІГіК.

## Спецыфіка развіцця культурна-асветнага руху на тэрыторыі Палескага ваяводства

Аналіз асобных фондаў Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці (ф. 1 – Палеская ваяводская ўправа, ф. 59 – Папячыцельства Брэсцкай школьнай акругі, ф. 115 – Грамадскія арганізацыі моладзі Палескага ваяводства, ф. 116 – Палітычныя партыі

Палескага ваяводства, ф. 263 – Саюзы, камітэты, таварыствы сельскай гаспадаркі Палескага ваяводства, ф. 2156 – Дабрачынныя і культурна-асветныя арганізацыі, таварыствы Палескага ваяводства), а таксама ф. 880 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь («Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры») дазваляюць зрабіць наступныя высновы наконт спецыфікі развіцця культурна-асветнага руху і існавання адпаведных арганізацый на тэрыторыі Палескага ваяводства (паветы Брэсцкі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі, Кашырскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Столінскі).

Па-першае, разглядаючы лакалізацыю мясцовых суполак БІГіК, неабходна адзначыць, што яны размяшчаліся на самым паўночным захадзе рэгіёна (Пружанскі і Косаўскі паветы); на поўдні ваяводства трывалае распаўсюджанне атрымала дзейнасць украінскага таварыства «Прасвіта»; праца Таварыства беларускай школы даволі раўнамерна ахоплівала цэнтральную і паўночна-заходнюю частку ваяводства. Такое тэрытарыяльнае размяшчэнне нацыянальных арганізацый – украінскай і беларускіх – тлумачыцца адпаведным нацыянальным складам рэгіёна (цікавай ілюстрацыяй у дадзеным кірунку побач з лічбамі перапісаў насельніцтва можа быць статыстыка нацыянальнага прадстаўніцтва ў мясцовых выбарных органах, адпаведна з якой большасць прадстаўнікоў-украінцаў прыпадае якраз на Брэсцкі, Кобрынскі, Драгічынскі і Кашырскі паветы), а таксама лакалізацыяй цэнтраў названых арганізацый (дадзены фактар з'яўляецца неабходным для ўліку пры аналізе тэрытарыяльнага размяшчэння суполак беларускіх нацыянальных арганізацый – так, нягледзячы на даволі раўнамернае прадстаўніцтва беларусаў у мясцовых органах Пружанскага, Косаўскага, Пінскага, Столінскага і Лунінецкага паветаў, найбольшая колькасць рэгіянальных суполак беларускіх нацыянальных культурна-асветных арганізацый прыпадае менавіта на Косаўскі і Пружанскі паветы як найбліжэйшыя да Вільні) [5].

